16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 32 (5241) 11 жніўня 2023 г.

ISSN 0024-4686

З найлепшымі пажаданнямі ад аўтараў стар. 4

Невычэрпнасць крыніцы натхнення стар. 12

Мяжа паміж выдуманым і рэальным стар. 13

Мелодыі народнага

Ігар Лучанок… Ён напісаў больш за чатырыста песень — творы на яго музыку выконвалі «Верасы» і «Песняры», Эдуард Хіль, Леў Лешчанка, Валянціна Талкунова, Рэнат Ібрагімаў і многія іншыя. Узначальваў Саюз кампазітараў Беларусі амаль 40 гадоў — спрыяў самым розным музычным ініцыятывам. Яго цаніла кіраўніцтва савецкай і суверэннай Беларусі, яго любілі мільёны слухачоў.

Калі ў вечнасць сыходзяць тыя, каго называюць чалавекам-эпохай, здаецца, што свет бяднее. Напісанае, вядома, застаецца, толькі ўжо без аўтара, якому часам хочацца выказаць удзячнасць. Вядома, што народны артыст СССР і БССР Ігар Лучанок доўга хварэў, але ўсё роўна смерць майстра ўскалыхнула грамадства. 12 лістапада 2018 года Беларусь развіталася з любімым кампазітарам. Шматлікія прыхільнікі таленту Ігара Міхайлавіча аддавалі даніну памяці і павагі чалавеку, на чыіх песнях вырасла не адно пакаленне.

6 жніўня яму споўнілася б 85 гадоў… У гэтыя дні хтосьці ўспамінае яго добрым словам, хтосьці пераслухоўвае ўлюбёныя песні, а нехта і завітвае на Усходнія могілкі горада Мінска, дзе знайшоў спачын знакаміты беларус.

Аднойчы Ігар Міхайлавіч напісаў: «Мару, каб мая душа, якую я ўклаў у песні, хаця б нейкай часцінкай перадалася маім слухачам, тым, хто любіць народную мелодыю, тым, хто адчувае ў маіх песнях святло, надзею. Буду шчаслівым, калі застануцца жыць хаця б адна-дзве мае песні. Тады і я, кампазітар, буду жыць». Ці спраўдзіцца жаданне майстра? Усё ж час бяжыць, падыходы да стварэння песень вокамгненна змяняюцца, сучаснасць скіроўвае ўвагу слухача на самую розную музыку… Насуперак любым гіпотэзам ёсць спадзяванне, што ні «Мой родны кут», ні «Жураўлі на Палессе ляцяць», ні «Вераніка», ні «Спадчына», ні многія іншыя песні Ігара Лучанка не забудуцца суайчыннікамі.

Працяг на стар. 2 ►

Фота Юрыя Іванова.

Ігар Лучанок.

«ЛіМ»-акцэнты

Пашана. Дзяржаўных узнагарод удастоены 46 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 жніўня. Ордэны, медалі і ганаровыя званні ім прысуджаны за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры ратаванні чалавека на вадзе, значны асабісты ўклад у развіццё судовай сістэмы, нафтаперапрацоўчай і хімічнай прамысловасці, сельскагаспадарчай вытворчасці, дарожнага будаўніцтва, дасягненні ў сферах адукацыі, сацыяльнай абароны насельніцтва, гандлю, навукі і культуры. Сярод узнагароджаных — калекцыянер, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Ліхадзедаў. Ён удастоены медаля Францыска Скарыны.

Спачуванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнай артысткі РСФСР Ірыны Мірашнічэнкі. «Пайшла з жыцця таленавітая актрыса, любімая многімі пакаленнямі гледачоў. Створаныя Ірынай Пятроўнай выдатныя вобразы пакінулі яркі след у гісторыі савецкага і расійскага тэатра і кінематографа», — гаворыцца ў спачуванні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што светлая памяць пра Ірыну Мірашнічэнку назаўсёды будзе жыць у нашых сэрцах.

Вернісаж. Выстаўка «Мінскі настрой» адкрылася ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Арганізатарамі выступаюць Музей гісторыі горада Мінска і Беларускі саюз мастакоў. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 60 твораў жывапісу і графікі ў жанрах гарадскога пейзажа, партрэта, сюжэтна-тэматычнай карціны. Мінск і мінчане адлюстраваны ў работах народных мастакоў Беларусі Г. Вашчанкі, Г. Паплаўскага, а таксама такіх вядомых аўтараў, як С. Герус, А. Тычына, Р. Кудрэвіч, І. Басаў, Ф. Бараноўскі, У. Пасюкевіч, А. Кроль, і многіх іншых. Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны творчасці А. Тычыны. Прадстаўлены яго літаграфіі, лінагравюры і акварэльныя замалёўкі горада 1970–1980-х гадоў. Да таго ж у экспазіцыі працуе відэазона, дзе можна паглядзець дакументальныя фільмы пра горад. Выстаўка працягнецца да 3 верасня.

Пярэдадзень. Дзяржаўная ўстанова культуры «Культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк» горада Гарадка запрашае на рэспубліканскую акцыю дарэння кніг пісьменнікаў грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» бібліятэкам Гарадоцкай ЦБС. Мерапрыемства, прымеркаванае да юбілейнага XXX Дня беларускага пісьменства, адбудзецца 15 жніўня ў 12.00 (вул. Ленінская, д. 4). Удзел у мерапрыемстве прымуць таксама члены Віцебскага абласнога аддзялення СПБ.

Памяць. 13 жніўня, у дзень памяці Якуба Коласа, на Вайсковых могілках адбудзецца памінальны мітынг і ўскладанне кветак да магілы Песняра. Удзел у жалобнай імпрэзе прымуць члены сям'і Якуба Коласа, літаратары, грамадскія дзеячы, мастакі, навукоўцы, прыхільнікі творчай спадчыны народнага паэта Беларусі. Пачатак мерапрыемства ў 13.00. Між тым у рамках дзён памяці Якуба Коласа 14 жніўня адбудзецца куратарская экскурсія па часовай экспазіцыі «…Не забывайце. Якуб Колас». На выстаўцы можна будзе ўбачыць унікальныя музейныя прадметы: пасмяротную маску Якуба Коласа (аўтарства скульптара-манументаліста Заіра Азгура), унікальныя фотаздымкі жалобнай працэсіі і спачувальныя тэлеграмы, якія рэдка паказваюць наведвальнікам.

Ініцыятыва. Скульптурную кампазицыю ад віцебскага майстра Івана Казака адкрыюць у Багушэўску напярэдадні Дня народнага адзінства, піша БелТА. На пастаменце будуць памешчык Дзмітрый Багушэўскі і яго жонка Марыя. Афіцэр, 200-годдзе з дня нараджэння якога мясцовыя жыхары збіраюцца святкаваць у канцы жніўня, валодаў землямі, да якіх належаў і цяперашні гарадскі пасёлак. Пры будаўніцтве чыгункі ў пачатку XX стагоддзя яму прапанавалі прадаць частку свайго маёнтка, каб правесці пуці для паяздоў. Дзмітрый Багушэўскі падараваў патрэбны ўчастак, але з умовай, што чыгуначная станцыя будзе названа ў гонар яго жонкі. І цяпер населены пункт называецца Багушэўск, а станцыя — Багушэўская.

Конкурс. Міністэрства спорту і турызму інфармуе, што працягваецца прыём заявак на III Рэспубліканскі конкурс сацыяльнай рэкламы «#ПазнайБеларусь». Праект праводзіцца з мэтай папулярызацыі ўнутранага турызму. Да ўдзелу запрашаюцца прадстаўнікі розных прафесій і ўзростаў, у тым ліку навучэнцы ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, іншых адукацыйных устаноў. У конкурсе заяўлена 3 намінацыі: «Слоган», «Плакат» і «Відэаролік» (паднамінацыі «Відэаролік арганізацыі» і «Відэаролік вандроўніка»). Заяўку неабходна падаць разам з конкурснай работай не пазней за 1 верасня.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

повязі

Эксперты шукаюць вялікія кнігі

Акадэмія Нацыянальнай літаратурнай прэміі «Большая кніга» Расіі аб'явіла імёны 107 экспертаў, якія ў сёлетнім сезоне ўвойдуць у склад журы конкурсу. Па меркаванні яго арганізатараў, вялікая колькасць спецыялістаў дае магчымасць найбольш аб'ектыўна вылучаць лаўрэатаў прэміі.

Да ўдзелу ў кароткім спісе конкурсу дапушчаны 15 аўтараў. Заснавальнікі і папячыцелі «Большой книги» лічаць, што творы кароткага спісу маюць высокія мастацкія вартасці і могуць разлічваць на больш уважлівае стаўленне да іх. Такім чынам, творы аўтараў, якія дайшлі да фіналу, стануць прадметам паглыбленага чытання дзеячаў навукі, культуры і адукацыі, прафесійных літаратараў, прадпрымальнікаў — тых, хто ўвайшоў у склад журы і хто неабыякавы да лёсу расійскай славеснасці.

Ліст з запрашэннем далучыцца да ліку экспертаў дырэктар прэміі «Большая кніга» літаратурнай акадэміі Дзмітрый Бак накіраваў і пісьменніцы з Беларусі Алене Стэльмах, якая добра вядомая сваімі праектамі з расійскімі літаратарамі.

— Для мяне гэта вельмі знакавая падзея, — кажа Алена Анатольеўна. — Апошнім часам давялося ў якасці перакладчыка судакрануцца з сучаснай рускай прозай, якая працягвае найлепшыя традыцыі класікаў і здзіўляе сваімі навацыямі. І вось зараз — самае новае, што трапляе на слых пакуль журы, а ў далейшым, я думаю, захопіць і шырокага чытача.

Вызначаць пераможцаў — гэта заўсёды адказна і складана, — працягвае Алена Стэльмах. — Адказваючы на пытанне, чым кранула або прыцягнула ўвагу тая або іншая кніга, «прафесійны чытач» звычайна робіць акцэнт на праблематыцы — актуальнасць, гуманізм ідэі, навізна рашэння; сюжэце — арыгінальнасць развіцця, логіка пабудовы; стылі — пластыка, рознабаковасць, багацце і асаблівасці аўтарскай мовы. Менавіта з такімі падыходамі я ўжо распачала чытацкі марафон па старонках кніг сучасных расійскіх аўтараў. Знаёмства з першымі творамі сведчыць пра іх высокія мастацкія вартасці і верагодныя чытацкія сімпатыі.

Бланкі з галасаваннем членаў журы павінны паступіць у аргкамітэт да 27 лістапада бягучага года. А ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў «Большой книги» адбудзецца ў Маскве ў пачатку снежня.

Марыя ЛІПЕНЬ

Па ваколіцах Уфы

Апошні час складваюцца даволі трывалыя стасункі паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Башкартастан (Расійская Федэрацыя) у галіне культуры. Гэтаму паспрыяў і беларуска-расійскі форум, які прайшоў ва Уфе — сталіцы Башкартастана.

Да ліку адметных творчых праектаў належыць і мастацкі пленэр беларускіх і расійскіх мастакоў у Башкартастане. Расказвае адзін з яго ўдзельнікаў — беларускі жывапісец Віктар Барабанцаў:

— Каля месяца мы працавалі ў розных ваколіцах Уфы. Я з вялікай цікавасцю адкрываў для сябе башкірскія краявіды. Ды і не толькі краявіды. З прыемнасцю пазнаёміўся з многімі яркімі асобамі ў башкірскім нацыянальным жывапісе. Здавалася б, выяўленчае мастацтва носіць выключна інтэрнацыянальны характар, а вось пэўныя драбнічкі сведчаць, што ў працах башкірскіх мастакоў ёсць свае адметнасці, сваё, як кажуць, аблічча. Башкартастану па выніках пленэру я пакінуў партрэт башкіркі. Цэлы шэраг напрацовак прывёз дахаты, у Беларусь. Лічу, што час не змарнаваў… І Башкартастан, яго людзі надоўга застануцца ў маёй творчай і проста чалавечай памяці.

У пленэры ў Башкартастане прынялі ўдзел і іншыя творцы з Беларусі. У іх ліку — старшыня Беларускага Саюза мастакоў Глеб Отчык, жывапісец Леанід Гоманаў.

Дарэчы, сёлета было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж дзвюма пісьменніцкімі арганізацыямі — Беларусі і Башкартастана. Мяркуецца, што ў бліжэйшы час пабачаць свет зборнікі твораў пісьменнікаў Беларусі — ва Уфе, у перакладзе на башкірскую мову, а ў Мінску — анталогія башкірскай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову.

Выдатна было б, каб такую інтэграцыйную працу ў галіне культуры прадоўжылі і іншыя творчыя аб'яднанні Беларусі і Башкартастана, што, безумоўна, паспрыяе яднанню нашых народаў, развіццю ўяўленняў пра беларускую культуру ў Башкартастане, пра башкірскую нацыянальную культуру — у Беларусі.

Раман СЭРВАЧ

з нагоды

Мелодыі народнага

Каб болей даведацца пра знакамітага кампазітара, раім аматарам яго творчасці завітаць у Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (філіял Нацыянальнага гістарычнага музея) — там нядаўна адкрылася выстаўка «Песні на ўсе часы», прысвечаная жыццю Ігара Лучанка.

Фрагмент экспазіцыі.

Прымеркаваная да 85-годдзя з дня яго нараджэння экспазіцыя дазваляе адчуць атмасферу, у якой жыў аўтар музыкі, убачыць, з кім ён будаваў творчыя ўзаемаадносіны і што яго натхняла. У праекце прадстаўлены экспанаты выключна з фондаў Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. Арганізатары падкрэсліваюць, што многае наведвальнікі ўбачаць упершыню.

Што ўвайшло ў часовую экспазіцыю? Найперш фотаматэрыялы пра жыццёвы і творчы шлях народнага артыста, фатаграфіі з сямейных альбомаў родных і блізкіх Ігара Міхайлавіча. Дапаўняюць яе нотныя рукапісы і зборнікі песень, пласцінкі з запісамі твораў, віншаванні, граматы, афішы. Сярод унікальных экспанатаў — аўтограф Ігара Лучанка, рукапісы розных гадоў і фатаграфіі з дзеячамі культуры. Гэта Аляксандра Пахмутава, удзельнікі ансамбляў «Песняры» і «Верасы»…

Здольная здзівіць наведвальніка выстаўкі «Песні на ўсе часы» прысутнасць асабістых рэчаў бацькі кампазітара — Міхаіла Лучанка. Ён быў артыстам трупы вандроўнага тэатра Уладзіслава Галубка. Так, прадстаўлены скрыпка і тыя атрыбуты касцюма, у якіх Міхаіл Лучанок выходзіў на сцэну. Шмат цікавага могуць расказаць таксама фатаграфіі, зробленыя трупай Уладзіслава Галубка.

Пазнаёміцца з выстаўкай «Песні на ўсе часы» ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры можна да 29 кастрычніка.

Яўгенія ШЫЦЬКА
Фота Кастуся ДРОБАВА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

праекты

Роздумы пра бясконцасць

Урачыстае адкрыццё выстаўкі Уладзіміра Пракапцова «Пад знакам бясконцасці» адбылося днямі ў выставачным корпусе Нацыянальнага мастацкага музея. Праект прысвечаны 70-годдзю мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў, кандыдата мастацтвазнаўства, ганаровага прафесара Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, ганаровага акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў. Прымеркаваны ён таксама да 25-годдзя дзейнасці Уладзіміра Іванавіча на пасадзе генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея.

Падчас урачыстага адкрыцця.

Сярод тых, хто завітаў на ўрачыстае адкрыццё і выступіў з прывітальным словам, — начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына Карповіч; генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Ганна Конанава; старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб Отчык; старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццяна Філімонава; рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская; дырэктар Добрушскага раённага краязнаўчага музея Аляксандра Шпакава; дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Сяргей Крыштаповіч; прарэктар па вучэбнай рабоце Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава Міраслава Бобрык.

Выстаўка Уладзіміра Пракапцова «Пад знакам бясконцасці» паказвае разнастайнасць творчых інтарэсаў аўтара як мастака, мастацтвазнаўцы і арганізатара музейнай справы Беларусі. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 35 работ з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея, Музея гісторыі горада Мінска, карпаратыўнай калекцыі ААТ «Приорбанк» і асабістай калекцыі аўтара. Перыяд стварэння прадстаўленых карцін — з 80-х гадоў XX стагоддзя да сёння. Гэта пейзажы, нацюрморты, партрэты, эпічныя палотны, а таксама карціны, створаныя падчас мастацкіх акцый у Віцебску. Упершыню экспануюцца тры новыя творы: «Настальгія», «Суладдзе зямнога і нябеснага. Памяці Веры» і «Дарога дадому».

Дарэчы, на выстаўцы можна ўбачыць кнігі Уладзіміра Пракапцова, прысвечаныя вядомым майстрам Беларусі — Станіславу Жукоўскаму, Вітольду Бялыніцкаму-Бірулю, Фердынанду Рушчыцу і іншым. Выданні ўвайшлі ў серыю «Славутыя мастакі з Беларусі», ініцыятарам якой з'яўляецца Уладзімір Іванавіч.

Куратарам выстаўкі выступае Надзея Усава, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-асветніцкай работы. Праект працягнецца да 9 верасня.

Яўгенія ШЫЦЬКА
Фота з сайта Нацыянальнага мастацкага музея

Высокае майстэрства

Рэтравыстаўка мастацкай фатаграфіі «Фатаграфіка-73» адкрылася ў Магілёве. Работам, якія прапануюць арганізатары наведвальнікам музея імя В. Бялыніцкага-Бірулі, 50 гадоў. Апошні раз яны экспанаваліся ў 1973 годзе ў Мінску. І рэзананс быў вялікі не толькі ў маштабах былога Савецкага Саюза. Удзел у тым знакавым фотамерапрыемстве бралі 94 аўтары з 26 фотаклубаў розных краін. На жаль, выстаўка ў Магілёве па колькасці работ утрая меней за тую. Але эмоцыі яна выклікае, магчыма, нават большыя, чым тады. У час мабільных фотаапаратаў нават цяжка ўявіць сабе, якія цуды апрацоўкі выкарыстоўвалі пры стварэнні тых работ іх аўтары. Гэта сплаў высокага майстэрства, глыбокага ведання фотамастацкай справы, густу і неверагоднага цярпення.

— У Магілёў прыехалі найлепшыя работы той фотавыстаўкі, — знаёміць з праектам магілёўская фотамастачка Ірына Савосіна. — Нават 50 гадоў таму гэта была не проста выстаўка, а конкурс — з журы, пераможцамі, прызамі. І большасць экспанаваных у Магілёве работ — узнагародныя. Гэтыя фота і імёны сёння з'яўляюцца класікай як савецкай фатаграфіі, так і сусветнай. Юрый Васільеў і Самуіл Левіх, Віталь Бутырын, Юрый Шпагін, Яніс Глейздс, Юрый Палыгалаў, Павел Кунін — усе яны адзін да аднаго яркія мастакі, вядомыя сваімі непаўторнымі работамі. Сёння ў фоташопе, магчыма, і нескладана зрабіць падобнае. Але тады, працуючы з плёнкай у поўнай цемры, ніколі нельга было спрагназаваць, што атрымаецца. І атрымліваліся шэдэўры. Часам у адзіным экзэмпляры. Потым яго множылі з дапамогай фотаапарата або іншай спецыяльнай тэхнікі.

Кожную з пяцідзесяці работ можна назваць маленькім шэдэўрам, бо кожная рабілася з прымяненнем розных тэхнічных прыёмаў. Тут не толькі ідэя, але і тэхнічнае ўвасабленне — вышэйшы пілатаж. Гэта добрае веданне асноў хімічных і фізічных працэсаў, таго, як будзе праламляцца святло і ўздзейнічаць на фотаслой. Для стварэння адной работы выкарыстоўваліся фрагменты часам болей чым двух дзясяткаў кадраў. Як у фотатворах таго ж Віталя Бутырына або Вільгельма Міхайлоўскага.

— Здзівіць дасведчанае журы можна было толькі тым, чаго яшчэ ніхто не рабіў, — заўважае адзін з найбольш цікавых беларускіх майстроў фота, член народнага фотаклуба «Мінск» Віктар Бутра. — І гэтыя шэдэўры праходзілі па шматлікіх выстаўках і выклікалі захапленне ў розных краінах як у гледачоў, так і ў экспертаў. Людзі дасылалі фатаграфіі ў Мінск з Петрапаўлаўска-Камчацкага, Нарыльска, Северадзвінска, краін сацлагера. Прыходзілі работы з Іспаніі, Аргенціны. І гэта былі аўтары з сусветнымі імёнамі. На іх потым арыентаваліся іншыя, убачыўшы, якога ўзроўню можна дасягнуць у цалкам, здавалася б, вядомай фатаграфіі. Аказваецца, шмат што можна прыдумаць і ўвасобіць.

Гэта другая выстаўка з выставачнага праекта «Фатаграфіка». Першая была ў 1971-м. Яе вынікі настолькі ўразілі і арганізатараў, і гледачоў, што было вырашана рабіць яе як біенале — раз у два гады. Выстаўкі прайшлі ў 1971, 1973 і 1975 гадах, потым гэтая паслядоўнасць была парушана і аднавілася толькі ў 1978-м. Апошняя, шостая, адбылася ў 1989-м. І яна пазіцыянавалася мінскім народным фотаклубам ужо як салон мастацкай фатаграфіі.

— Мяняўся і падыход арганізатараў, і магчымасці, але ўсё гэта садзейнічала развіццю праектаў, — кажа Віктар Бутра. — Удзельнікі з'язджаліся з усяго Савецкага Саюза. Арганізатары рассылалі лісты, старшыня мінскага фотаклуба Яўген Казюля нават у свой адпачынак асабіста аб'язджаў фотаклубы Прыбалтыкі і Піцера з прапановай далучыцца. І яны адгукаліся. Асабліва актыўнымі былі прыбалты, яны вельмі шмат працавалі над самавыяўленнем. У апошніх фотавыстаўках удзельнічалі краіны сацыялістычныя і нават капіталістычныя. Адбор работ быў вельмі жорсткі. Прыходзіла каля паўтары тысячы, адбіралася 120—140.

Фотамайстар народнага фотаклуба «Мінск» Аляксандр Чанцоў адзначыў, што ідэя правесці ў Магілёве такую выстаўку была выклікана тым, што гэта вельмі фатаграфічны горад, дзе працавала шмат вядомых беларускіх аўтараў.

— Гэтая выстаўка, — кажа ён, — спроба прыцягнуць увагу цяперашняга гледача да старой класічнай фатаграфіі 1970-х гадоў. На дзіва, усе фота выглядаюць сучаснымі. Яны не страцілі ні актуальнасці, ні мастацкасці, вытрымаўшы праверку часам. Гэта сапраўднае мастацтва. Спадзяёмся, што мы яшчэ пакажам «Фатаграфікі» іншых гадоў. Гэтыя работы дэманструюць асаблівую школу фатаграфіі. А іх у савецкі час было тры — літоўская, харкаўская і мінская, да якой належаць таксама магілёўскія аўтары. Будзем брэнд нашай фатаграфіі прасоўваць і далей. Гэта наш здабытак, і нам нельга яго страчваць.

Нэлі ЗІГУЛЯ
Фота аўтара

«ЛіМ»-люстэрка

Міністр культуры Анатоль Маркевіч правёў сустрэчу з дэлегацыяй правінцыі Ганьсу Кітайскай Народнай Рэспублікі на чале з Чжан Юнся — начальнікам Дэпартамента прапаганды, членам пастаяннага камітэта правінцыі Ганьсу. У рамках візіту абмяркоўваліся пытанні беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Адзначаецца, што з улікам сучасных міжнародных тэндэнцый і патэнцыялу абедзвюх дзяржаў намечаны перспектывы ўзаемадзеяння, заснаваныя на багатых традыцыях культурнага абмену. Шмат увагі спікеры надалі развіццю супрацоўніцтва ў галіне адукацыі.

Генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава, дырэктар Нацыянальнага тэатра Нікарагуа Рамон Радрыгес і прэзідэнт Фонду *Incanto* Альберта Сан Хасэ Маліна падпісалі мемарандум аб двухбаковым супрацоўніцтве, інфармуе БелТА са спасылкай на *Telegram*-канал Вялікага тэатра. Дакумент аб двухбаковым супрацоўніцтве паміж айчынным Тэатрам оперы і балета, Нацыянальным тэатрам імя Рубена Дарыё і Фондам *Incanto* — Нікарагуанскім інстытутам вакалу падпісаны для эфектыўнага развіцця і ўмацавання сувязей паміж краінамі ў галіне балетнага, опернага і сімфанічнага мастацтва. Ён прадугледжвае ўзаемнае азнаямленне з дасягненнямі Беларусі і Нікарагуа, арганізацыю гастрольнай дзейнасці калектываў, абмен салістамі, ажыццяўленне сумесных пастановак, правядзенне майстар-класаў.

Гастролі трупы Казанскага акадэмічнага рускага Вялікага драматычнага тэатра імя В. І. Качалава пройдуць на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з 22 жніўня да 26 верасня. Гледачы змогуць убачыць спектаклі «Рэвізор», «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро», «Пікавая дама», «Скрыпач на даху», «Васа», «Баль злодзеяў» і рэтра-канцэрт «Калі запаляцца ліхтары» (гэта злучэнне музыкі, танцаў і песень мінулых гадоў). Між тым 21 і 22 кастрычніка тэатр імя Янкі Купалы прадставіць на сцэне Казанскага тэатра імя В. І. Качалава «Паўлінку», дадае агенцтва «Мінск-Навіны».

Амерыканскі кінарэжысёр Уэс Андэрсан будзе ўганараваны спецыяльным прызам *Glory to the Filmmaker* (Слава рэжысёру!) на 80-м Венецыянскім кінафестывалі. Цырымонія ўручэння адбудзецца 1 верасня. Як гаворыцца на сайце *film.ru*, узнагарода прымеркавана да прэм'еры кароткаметражнага фільма Уэса Андэрсана «Цудоўная гісторыя Генры Шугара». Экранізацыю кнігі Роальда Даля з Бенедыктам Камбербэтчам пакажуць у той жа дзень па-за конкурсам. Па словах праграмнага дырэктара агляду Альберта Барберы, стваральнік «Гатэля "Гранд Будапешт"» і многіх іншых знакавых карцін працягвае заставацца рэжысёрам, чый унікальны і беспамылковы стыль можна распазнаць усяго па адным кадры.

Камедыя «Красуні ва ўцёках» аскараноснага рэжысёра Ітана Коэна («Старым тут не месца») з'явіцца ў пракаце ў лютым 2024 года. Першапачаткова фільм мусіў выйсці ў верасні 2023-га. Карціна расказвае пра дзвюх сяброўак Джэймі і Мэрыян, якія едуць у падарожжа і адначасна трапляюць у эпіцэнтр вар'яцкіх падзей. Ролі ў стужцы выканалі Маргарэт Куэлі, Джэральдзін Вішванатан, Пэдра Паскаль, Мэт Дэйман, Біні Фелдштэйн і іншыя. Сцэнар Ітан Коэн напісаў сумесна з жонкай Трышай Кук. Раней стала вядома, што браты Коэны ўз'яднаюцца для працы над новым поўнаметражным праектам (сваякі часова разыходзіліся пасля вестэрна «Балада Бастэра Скрагса»).

Помнік пры жыцці заснавальнікам брытанскага рок-гурта *The Rolling Stones* — Міку Джагеру і Кіту Рычардсу — устаноўлены ў іх родным Дартфардзе пад Лонданам (графства Кент). Як паведаміў тэлеканал *Sky News*, скульптурная кампазіцыя пад назвай *The Glimmer Twins* была адкрыта 9 жніўня. Аўтарам з'яўляецца скульптар Эмі Гудман, якая адлюстравала Міка Джагера падчас скачка з мікрафонам. Яму акампаніруе на гітары Кіт Рычардс. У 2018 годзе на платформе чыгуначнай станцыі Дартфарда з'явілася табліца, якая паведамляла, што менавіта ў гэтым месцы два тутэйшыя хлопцы Джагер і Рычардс сустрэліся 17 кастрычніка 1961 года. У выніку быў заснаваны гурт *The Rolling Stones*.

Па дадзеных кампаніі-дыстрыб'ютара *Warner Bros*, зборы фільма «Барбі» дасягнулі адзнакі ў мільярд долараў усяго за 17 дзён пасля яго выхаду на экраны. Такім чынам, Грэта Гервіг стала першай жанчынай-рэжысёрам, чый фільм, зняты самастойна, без дапамогі сурэжысёра, сабраў больш за мільярд долараў, інфармуе руская служба *BBC News*. «Ніхто, акрамя Грэты Гервіг, не здолеў бы ажывіць гэты культавы для розных пакаленняў персанаж і яе свет у такой пацешнай, эмацыйнай і займальнай гісторыі, літаральна афарбаваўшы ўвесь свет у ружовы колер», — адзначыў Джэф Голдштэйн, прэзідэнт *Warner Bros* па ўнутранай дыстрыб'юцыі ў ЗША.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Чытачам Гарадка і Гарадоччыны — падарунак ад пісьменнікаў

Новая кніжная ініцыятыва стартавала напярэдадні правядзення XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку, які адбудзецца 2—3 верасня 2023 года. У новую сталіцу традыцыйнага свята прыехала дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі з бібліятэкай кніг у падарунак ад літаратараў краіны.

Удзел ва ўрачыстай цырымоніі ў Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы прыняў намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі. Выступаючы перад гаспадарамі і гасцямі кніжнага свята, Ігар Іванавіч адзначыў ролю друкаванай кнігі ў патрыятычным, духоўным выхаванні грамадства. Расказаў пра шырокамаштабную працу дзяржавы, непасрэдна Міністэрства інфармацыі ў плане падтрымкі айчыннага кнігавыдання. Намеснік міністра інфармацыі выказаў надзею, што Дзень беларускага пісьменства ў Гарадку прыўнясе самыя неспадзяваныя культурна-асветніцкія навацыі ў жыццё Гарадка, Гарадоцкага раёна. Старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына Палякова, дырэктар Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі Ада Абрамава падзякавалі за такі шчодры, знакавы кніжны падарунак ад пісьменнікаў літаральна ўсёй краіны.

Ада Абрамава.

Каментуючы асветніцкую падзею, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч адзначыў, што ў горад — новую сталіцу Дня беларускага пісьменства літаратары прывезлі больш за 400 выданняў, калі быць дакладнымі — 417 экзэмпляраў кніг сучаснай паэзіі, прозы, публіцыстыкі, краязнаўства. У бібліятэчцы, якая дастаўлена з Мінска, — кнігі з аўтографамі. Свае пажаданні выклалі Мікалай Чаргінец, Іна Фралова, Алена Стэльмах,

Алесь Карлюкевіч і Ігар Бузоўскі.

Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Сяргей Трахімёнак, Генадзь Аўласенка, Ганна Чыж-Літаш, Алесь Бадак, Віктар Шніп, Уладзімір Мазго, Міхась Пазнякоў, Мікола Чарняўскі, Ірына Карнаухава і шмат хто яшчэ. Паэты, празаікі, публіцысты пакінулі самыя цёплыя, сардэчныя словы пажаданняў у адрас чытачоў такога прыкметнага куточка Віцебскай старонкі. Акцыі падобнага характару ў наступныя гады пройдуць і ў іншых сталіцах Дня беларускага пісьменства. А яшчэ кіраўнік творчай арганізацыі паабяцаў, што пісьменнікі краіны часцей будуць прыязджаць у Гарадок не толькі ў святочныя дні. У верасні і ў наступныя месяцы 2023 года з прэзентацыямі і аўтограф-сесіямі ў Гарадоцкі раён наведаюцца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Генадзь Аўласенка, Ганна Чыж-Літаш, Іна Фралова, Віктар Шніп і іншыя пісьменнікі, чые кнігі карыстаюцца папулярнасцю ў чытачоў Беларусі.

Расказваючы гасцям пра характар сённяшняй працы з чытачом, кіраўнік бібліятэкі Ада Абрамава звярнула ўвагу на тое, што ў наведвальнікаў ёсць асаблівая запатрабаванасць на адкрыццё новых кніг, якія носяць светлы, духоўны характар. Чытачы розных узроставых груп цікавяцца праваслаўнай літаратурай. Удзел у акцыі дарэння прымалі і супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда». Спецыяліст аддзела рэалізацыі кніжнай прадукцыі Людміла Драздова звярнула ўвагу на тыя кніжныя навінкі, якія выйдуць у «Звяздзе» ў бліжэйшыя месяцы. У прыватнасці, размова ішла пра кнігу гродзенскага краязнаўцы Святланы Кошур «Праз паціну часу: сцежкамі Свіцязянскай зямлі», публіцыстычную кнігу рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта доктара педагагічных навук Андрэя Караля «Дарогі *vs* сэнсы: адукацыйныя заметкі», працяг мемуарнага цыкла «Цяжкія дарогі жыцця» Мікалая Чаргінца — павінны пабачыць свет дзве кнігі народнага пісьменніка Беларусі; зборнік вершаў маладога паэта Рагнеда Малахоўскага, кнігу нарысаў журналісткі Ірыны Аўсеп'ян «Ведаем, ганарымся!», зборнік фантастычных апавяданняў Алены Беланожкі «Дзіця Зямлі»... Безумоўна, усе гэтыя выданні патрапяць і ў Гарадок. Дарэчы, на XXX Дні беларускага пісьменства ў Гарадку будзе прэзентавана новая кніга Уладзіміра Ліхадзедава з серыі «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» — «Ад Віцебска да Полацка», у якой сабраны рэпрадукцыі старых паштовак пра гарады і іншыя паселішчы Віцебшчыны. Ва ўдзельнікаў свята будзе магчымасць, разгарнуўшы старонкі філакартычнага альбома, ажыццявіць віртуальнае падарожжа па розных куточках Віцебскай вобласці.

Кастусь ЛЕШНІЦА
Фота Кастуся ДРОБАВА

Школа беларусістаў

4 жніўня адбылося ўрачыстае адкрыццё Летняй школы беларускай мовы і культуры ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

Амаль два тыдні маладыя даследчыкі-беларусісты з розных ВНУ свету будуць вывучаць беларускую мову, беларускую літаратуру і беларускі фальклор, а таксама атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з культурна-асветніцкімі ўстановамі Гродна і ваколіц.

На адкрыцці Летняй школы беларускай мовы і культуры «Пад светлым іменем Купалы» яе ўдзельнікаў вітала рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта кандыдат гістарычных навук Ірына Кітурка. Ірына Фёдараўна звярнула ўвагу на багатыя асветніцкія традыцыі ўніверсітэта, яго сістэмную далучанасць да развіцця беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства ўвогуле ў межах краіны. ВНУ адпавядае і таму высокаму імені, якое яна носіць, — купалазнаўства, ушанаванне памяці народнага песняра Беларусі сталі грунтам для выхавання ў сценах універсітэта гуманістычна развітой асобы студэнта, дыпламаванага спецыяліста ў розных галінах народнай гаспадаркі.

Чытаннем вершаў народнага паэта Беларусі, урыўка з яго паэмы «Курган», выкананнем песні «Спадчына»

Ірына Кітурка.

на словы Купалы прадоўжылася вітанне даследчыкаў-беларусістаў.

— Мы рады, што Летняя школа праводзіцца ў нас не першы год, — зазначыў кіраўнік Летняй школы беларускай мовы і культуры, дырэктар Навуковай бібліятэкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Мікалай Грынько. — Сёлета ў ёй удзельнічаюць прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі — з Варонежскага ўніверсітэта, а таксама Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. А яшчэ прыехалі маладыя беларусісты з Германіі і Узбекістана. Мы будзем не толькі чытаць ім лекцыі, а і пазнаёмім з Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Я. Карскага, музеямі Максіма Багдановіча і Элізы Ажэшкі, Цэнтрам рамёстваў «Спадчына».

Аляксандра Шырокава.

Спадзяёмся, што ўсе нашы госці паедуць да сябе на радзіму з добрымі ўражаннямі, стануць нашымі партнёрамі ў вывучэнні гісторыі і культуры Беларусі, беларускай мовы і беларускай літаратуры. Мяркуем, што захаваюцца нашы стасункі, якія паспрыяюць новым ініцыятывам.

Удзел у адкрыцці Летняй школы беларускай мовы і культуры «Пад светлым іменем Купалы» прыняў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Ён звярнуў увагу на беларускую літаратурна-мастацкую перыёдыку, на часопісы «Полымя», «Маладосць», «Нёман», газету «Літаратура і мастацтва», якія з задавальненнем прадставяць свае старонкі для публікацыі

мастацкіх і публіцыстычных твораў удзельнікаў школы, арганізаванай Гродзенскім універсітэтам. Ад імя замежных студэнтаў, аспірантаў на свяце адкрыцця выступіла Аляксандра Шырокава з Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Сваё прывітанне яна выклала на чысцюткай беларускай мове. Дарэчы, Аляксандра не ўпершыню наведвае Гродна і Гродзенскі ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Раман СЭРВАЧ
Фота Кастуся ДРОБАВА

Гняздоўе — родная хата

Некалькі сустрэч, што адбыліся ў «ЛіМе» ў пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя, з'яўляліся ў пэўнай ступені выпадковымі, а значыць, як бы спантаннымі. Гаварылася нібыта аб усім, а па сутнасці гэта былі звычайныя размовы, што ўзнікаюць, калі ў рэдакцыю завітвае чарговы аўтар. Нават і той, які ўжо бываў да гэтага. У Артуры Цяжкім запомнілася хіба тое, што ён быў высокі, стройны і прыгожы тым мужчынскім характвом, якое арганічна пасуе чалавеку. Твар крыху аскетычны, усмешка нейкая быццам сарамлівая. Усмешку яго добра запомніў і Генадзь Шупенька, выдавецкі рэдактар яго першай кнігі «Сустрэча пасля вясны», якая выйшла ў 1980 годзе. Пазней ён пісаў: «Ледзь прыкметная, нейкая нясмелая ўсмешка як бы ў нечым вінаватага чалавека, які, адчувалася, ажно зашмат перажыў, але не растраціў цеплыні душы — душы паэтычнай, глыбіннай, улюбёнай у навакольны свет і людзей». Дарэчы, ён пісаў і вершы, хоць і няшмат.

Пакуль не здавалася сэрца

Можа і завельмі сказана — «зашмат перажыў», але што яго жыццёвыя сцяжыны былі няпростыя, нават пакручастыя, — праўда. Да сваёй першай кнігі ён ішоў доўга. «Сустрэча пасля вясны» з'явілася, калі споўнілася 37 гадоў. Хоць дэбютаваў кароткімі апавяданнямі «Бульба», «Пралеска», «Маленькі эпізод», «Аднойчы ноччу» яшчэ ў 1966 годзе. Дарэчы, у «ЛіМе» (нумар за 19 ліпеня). У наступным годзе выступіў і ў «Чырвонай змене».

Нарадзіўся Артур Цяжкі ў вёсцы Лылойцы Смаргонскага раёна 23 ліпеня 1943 года. Вайна, здавалася б, павінна была абмінуць яго — як-ніяк, а першая, такая цяжкая палова выпрабаванняў народам была пераадолена. Не мінула… Аб гэтым, між іншым, ён згадваў у аўтабіяграфічнай аповесці «Смутак»: «У маленстве я дужа часта хварэў. Асабліва зімой і ў пачатку вясны. Вінавата вайна. Цені яе яшчэ ўсё блукалі над стомленай зямлёй. Усё яшчэ ўзрываліся міны і снарады, паміралі ад цяжкіх ран франтавікі і партызаны, даймаў пасляваенны голад і розныя хваробы (…)».

У яго было хворае сэрца. Скончыўшы Свірскую сярэднюю школу Мядзельскага раёна, працаваў трактарыстам, служыў у войску. На факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вучыўся завочна, скончыў яго ў 31 год. Да ўсяго і асабістае жыццё складвалася нялёгка. Адным словам, лёс пастаянна рыхтаваў іспыты. Пакуль мог, вытрымліваў іх. Вытрымліваў, пакуль не здавалася сэрца…

З увагай да «мяккіх аптымістаў»

Першая яго кніга, на жаль, прайшла незаўважанай. Праўда, апроч водгуку Генадзя Шупенькі на яе з'явілася рэцэнзія ў маскоўскім часопісе «Литературное обозрение», але толькі праз тры гады пасля яе выхаду. Крытыка звяртала ўвагу на аўтараў, на думку яе, больш перспектыўных і таленавітых. Звычайная з'ява… Канешне, у зборніку «Сустрэча пасля вясны» Артур Цяжкі «зорак не хапаў». Былі ў ім апавяданні («Нялюбая», «Філасофія дзядзькі Паўлюка», «Банальная гісторыя» і іншыя), у якіх праглядвалася звычайнае вучнёўства.

Малады пісьменнік з цяжкасцю пераадольваў жыццёвы матэрыял, які назапасіў, працуючы журналістам, не заўсёды ўмеў узняцца над дакументальнай асновай. Нібыта ў творах і ёсць падзеі, што патрабуюць свайго мастацкага асэнсавання, людзі, пра якіх можна і трэба гаварыць. Аднак уся бяда ў тым, што з-за нявопытнасці аўтара персанажы гэтыя так і не сталі яркімі, запамінальнымі характарамі. Як быццам мастак паспеў зрабіць пэндзлем адзін-два штрыхі ды спыніўся ў сваёй працы, бо яму стала проста не па сіле пакласці той асноўны, галоўны штрых, пасля якога чалавек засвеціцца як асоба, стане індывідуальнасцю.

Пакуль што адбывалася толькі назапашванне — назіранняў, матэрыялу. Патрэбен быў час, каб усё гэта ўнутрана перапрацаваць, пераасэнсаваць. Як, напрыклад, у апавяданні «Ужо сонейка на лес коціцца». Таксама з першай кнігі, але яно засведчыла здольнасць Артура Цяжкага паэтызаваць, узвышаць людзей, якіх праз столькі гадоў ён трапна назаве «мяккімі аптымістамі».

Пачатак твора больш чым традыцыйны, можна сказаць, у нечым заштампаваны. Прачынаюцца раніцой двое старых, што сумленна пражылі жыццё: «Адрабілі сваё. Прынясе ім паштальён у месяц сорак рублёў (канешне, за савецкім часам. — **А. М.**) на дваіх — і дзякуй. На хлеб, соль і іншыя паўсядзённыя патрэбы з гакам хапае. Ну а калі прыспічыць на што большае, то дзядзька Юзік з кніжкі здыме. Дзякуй Богу, яшчэ нейкая капейка водзіцца. Пазалетась свінню ў калгас прадалі, а летась восенню — быка».

Старыя дрэвы не перасаджваюць

Што яшчэ можна расказаць пра іх старасць? Два падыходы могуць быць. Першы — дзеці даўно забыліся пра бацькоў. Гэта любімы «конік» пісьменнікаў, якія тады толькі ўваходзілі ў літаратуру. Другі — дзеці ўзялі старых да сябе ў горад, а тыя ў гарадскіх умовах не прыжыліся, маркоцяцца па родных аселіцах і прысадах. У Артура Цяжкага — трэці падыход: «Няма чаго Богу грашыць — добрыя дзеці павырасталі. Ніхто бацькоў не цураецца. Праўда, сёй-той з вяскоўцаў часам папікне, мяўляў, чаму цябе дзеці з хутара ў вёску не перавезлі? А таму, што ён сам (дзядзька Юзік. — **А. М.**) не хоча. Старыя дрэвы не перасаджваюць».

Старымі дрэвамі, хоць і кволымі знешне, але моцнымі сваімі каранямі, і паўстаюць у апавяданні дзядзька Юзік і цётка Юзэфа. Пра адзін толькі дзень іх багатага і такога складанага жыцця расказаў пісьменнік, але так расказаў, што і душа людзей раскрылася, і самі яны павярнуліся тварам да чалавецтва. Менавіта да чалавецтва, бо на Юзіках і Юзэфах сама зямля трымаецца. На іх духоўнай моцы, на іх маральнай чысціні, на іх душэўным здароўі. Тады і фізічная нямогласць забываецца.

«Аб вечным жыцці, не сканчэнні свету, аб ясным сонцы над галавой», кажучы словамі самога Артура Цяжкага, ён павёў гаворку ў апавяданні. Павёў, каб прадоўжыць у сваёй другой кнізе «Пара блакітных дажджоў», якая выйшла праз два гады пасля першай. Пра яе мне ў свой час давялося пісаць у газеце «Голас Радзімы». Паўтарацца не буду, нагадаю толькі, што ў ёй, як і ў першай, быццам суседнічаюць між сабой два Артуры Цяжкія. Адзін з іх — журналіст, які прытрымліваецца жыццёвага факта, падзеі і, трапіўшы ў іх сіло, напружана шукае выйсце, каб шырэй зірнуць на свет і людзей, заглыбіцца ў іх лёсы і характары. Другі — пісьменнік, якому па сіле вырашэнне важных маральна-этычных праблем, аўтар, здольны да значных абагульненняў.

Артур Цяжкі.

Супраць душэўнай смуты

Трэцяя кніга Артура Цяжкага «Дзе мой дом?» выйшла ў 1986 годзе, калі пісьменніка ўжо не было ў жывых. Яна — своеасаблівы падрахунак спрэчкі Артура Цяжкага-журналіста і Артура Цяжкага-пісьменніка, у ёй адчуваецца прыярытэт апошняга. Гэтага не магла не заўважыць і крытыка, дружна адгукнуўшыся і на сам зборнік, і на адну з аповесцей, змешчаную ў чацвёртым нумары часопіса «Нёман» за 1986 год (рэцэнзія В. Жыбуля ў тым жа «Нёмане», І. Пітлер — у «ЛО», А. Пашчанкі — у «Детской литературе» і іншыя).

Ацэнка апошніх твораў Артура Цяжкага ў цэлым высокая. Найбольшую ўвагу крытыкі прыцягнулі аповесці «Дзе мой дом?» і «Смутак». Што тычыцца першага твора, дык некаторыя рэцэнзенты, як Генадзь Шупенька, бачаць у ім і «банальнае, нават нейкае наіўнае ў паказе "прыгожага" жыцця ў вялікім горадзе».

І ўсё ж, відаць, ёсць куды больш падстаў пагадзіцца з І. Пітлер («ЛО», 1987, № 1). Спрабуючы правесці паралель між дзвюма аповесцямі і як бы аб'яднаць іх (зрабіць гэта не так і складана, бо ў творах заўважаюцца пэўныя сюжэтныя падрабязнасці, адзін галоўны герой — Максім Гардзіевіч), рэцэнзент трапна знаходзіць зыходны момант, ідучы ад якога, адштурхоўваючыся, можна лепш зразумець сутнасць задумы і значнасць яе ўвасаблення. «Для сябе, для ўласнага, вельмі "практычнага" прымянення я палічыла магчымым суаднесці творы гэтага віду з дзвюма ўмоўнымі катэгорыямі: "ж а л е е м о г о" і «ж е л а е м о г о"». Я свядома пакідаю гэтыя два словы без перакладу, таму што пры пераўтварэнні па-беларуску страціцца абыгрываннe іх значэння, як гэта зрабіла І. Пітлер.

Калі прытрымлівацца яе разважанняў, творы, у якіх прысутнічае катэгорыя «жалаемого», — тыя, дзе назіраецца адыход ад самой праўды жыцця, больш за тое, жыццё прыхарошваецца, чалавечыя характары нівелююцца, глянцуюцца. «Прыкладаў "жалеемого" прыводзіць не трэба, яны навідавоку. Гэта тое найбольш значнае, што напісана ў апошнія гады аб збядненні і апусценні зямлі, выездзе моладзі ў горад, знікненні цэлых вёсак, не кажучы ўжо аб хутарах, аб забітых і знесеных хатах (зносіць — не будаваць!), аб знаходжанні чалавека, які не знаходзіць прыкладання сваіх магчымасцей на новым месцы, аб яго неўпарадкаванасці і душэўнай смуце, аб вялікім яго жаданні да незваротнага пакінутага», — працягвае І. Пітлер.

Балючае былое

Максім Гардзіевіч «плавае паміж небам і зямлёй», «плавае» паміж горадам і вёскай, спрабуючы знайсці адказ на пытанне, дзе сапраўдны прытулак. Дзе яго дом. А калі шырэй, дзе больш за ўсё ён патрэбны як чалавек і спецыяліст. У аповесці адчуваецца туга аб незваротна страчаным, якая часам набывае настальгічныя ноты.

Здараецца, што, завельмі канцэнтруючы ўвагу на «чувствительных» момантах з жыцця героя, Артур Цяжкі ў нечым збядняе вобраз Максіма, прызямляе яго, ператвараючы маладога чалавека ў нейкага сентыментальнага няўдачніка, што не здолеў выплыць з мора жыццёвых нягод, не справіўся з рулём якраз у той момант, калі патрабавалася асаблівая духоўная моц і фізічная вынослівасць. Астраўком у гэтым жыццёвым моры выглядае і няўдача Максіма з жаніцьбай. Пісьменнік чамусьці свядома абышоў падрабязнасці, паведамляючы толькі, што «некалі была гэта яго кватэра, якую ён пакінуў пасля разводу Іне. Цяпер тут жывуць чужыя людзі. Іна з сынам з'ехала на Поўнач».

Герой-апавядальнік аповесці «Смутак» — той самы Максім Гардзіевіч, праўда, у больш сталым узросце, назаўсёды развітваецца з хатай, у якой прайшло яго маленства, хутарам, дзе яго вытокі. Крыху раней памёр бацька, а цяпер не стала і маці. Браты хацелі адразу ўсё прадаць, каб частку грошай аддаць яму, малодшаму. Максім запрацівіўся, параіў пачакаць год. Цяпер, знаходзячы ў водпуску, жыве ў роднай хаце, згадваючы-ўспамінаючы многае, што назаўсёды засталося ў душы. Тым самым вяртанне да вытокаў — гэта і вяртанне туды, куды звароту няма і быць не можа.

«Чаго шукае Максім, бавячы дні ў апусцелай хаце? — запытаем услед за І. Пашчанка («ДЛ», 1987). — Падзеі, якія б дазволілі ўсвядоміць сябе? Нейкі ідэал дабра, страчаны ў мітуслівым гарадскім жыцці?» І разам з ёй адкажам: «Не. Усё нашмат прасцей і больш трагічна: хоча нарэшце ўзнавіць былое, пакуль не знік апошні з дваццаці хутароў у акрузе — матчын».

Гэтае вяртанне, няхай у думках, няхай на момант, неабходнае яму для таго, каб запомніць — цяпер ужо на ўсё жыццё запомніць: дзе б ён ні знаходзіўся, як і колькі ні быў, ні ў якім разе не павінен, не мае права забыць, што недзе на вялікай зямлі ёсць мясціна, дзе яго карані, адкуль пачаліся яго вытокі. Пакуль памятаць будзе, датуль там знойдзе духоўныя сілы. Матчын, бацькоўскі хутар для Максіма Гардзіевіча — і сама рэчаіснасць. Пакуль што рэчаіснасць. І свайго роду сімвал гняздоўя. А ўжо як сімвалу гэтаму жыць у яго памяці, залежыць ад самога. Толькі ад самога і больш ні ад кога.

Вартасць аповесці і ў тым, што ў ёй Артур Цяжкі стварыў цэлую галерэю па-сапраўднаму народных характараў, «мяккіх аптымістаў». Што ні чалавек, то адразу запамінаецца, бо аўтар знаходзіць такія штрыхі, якія пра яго шмат гавораць. Гэтае веданне жыцця ішло ад назіральнасці Артура Цяжкага, ад здольнасці знаходзіць з субяседнікам агульную мову. У аповесці ажываюць і тыя, з кім аўтар быў знаёмы з маленства.

* * *

Не стала Артура Цяжкага 5 красавіка 1984 года. Памёр у той хаце, якая перад адыходам у вечнасць і стала яго апошнім гняздоўем. Засталіся кнігі — як бачым, няшмат. Усё меней застаецца і тых, хто ведаў іх аўтара. Хацелася б спадзявацца, што знойдзецца той, хто перагорне іх старонкі. Творчы працэс — не толькі класіка, а ўсё напісанае. Ды, калі разабрацца, паняцце «класіка» — умоўнае. Нічога няма вечнага, апроч слова.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Што відаць у «Люстэрку»

Некалі ў маскоўскім выдавецтве «Современник» выходзіла серыя, у якой у якасці крытыкаў і літаратуразнаўцаў выступалі вядомыя паэты і празаікі. Нешта падобнае выдавала і «Молодая гвардия». У «Мастацкай літаратуры» серыі не было, але такія кнігі з'яўляліся. Для прыкладу, Ніла Гілевіча, Барыса Сачанкі, Івана Чыгрынава… Сёння нешта падобнае практыкуе выдавецтва «Чатыры чвэрці». Маецца на ўвазе бібліятэчка «Асоба і час». У Расійскай Федэрацыі падобныя кнігі таксама не абыдзены ўвагай. Пацвярджэнне гэтаму — «Зеркало» Наталлі Саветнай, што з'явілася ў Санкт-Пецярбурзе. Змест кнігі, як сказана ў падзагалоўку, склалі «артыкулы, нарысы, нататкі, інтэрв'ю аб слове, літаратуры, яднанні і міры, стварэнні і веры». Дасведчаныя чытачы ведаюць, што Наталля Саветная — вядомы празаік і паэт, публіцыст, літаратурны крытык, аўтар 17 кніг, выдадзеных у Беларусі, Расіі і Сербіі. І вось чарговая — «Зеркало».



Чаму такая назва, разважае ў прадмове «На нябачнай фотаплёнцы памяці» рэдактар кнігі, пісьменніца Аксана Яноўская: «Ці можа быць адлюстраванне без люстэрка? Мы назіраем яго ў вачах, у вокнах і вітрынах, на бліскучай паверхні прадметаў, на воднай гладзі, нават у кропельцы расы адлюстроўваецца сонца… Але ўсюды, дзе б ні з'яўлялася адлюстраванне, яно — на люстраной паверхні». На завяршэнне зазначае: «Спецыялісты ў галіне мовазнаўства мяркуюць, што слова "люстэрка" прыйшло са Старажытнага Рыма. (…) Упэўнена, шматколерны змястоўны спектр кнігі "Зеркало" Наталлі Саветнай праб'ецца праменнай энергіяй у свядомасць чытача і дапаможа ўбачыць уласную душу (…)».

Чытача чакае знаёмства з трыма раздзеламі: «Адлюстраванне» — развагі Наталлі Віктараўны пра асобныя кнігі і ўвогуле пра літаратурнае жыццё і, зразумела, сувязь з рэчаіснасцю — учарашняй і будучай, і жаданне прадбачыць дзень заўтрашні. «Пункт зроку» складзены з яе інтэрв'ю, дадзеных з рознай нагоды, у якіх згаданыя праблемы ў той ці іншай ступені знаходзяць таксама сваё адлюстраванне. Нарэшце — творчы партрэт Наталлі Саветнай, напісаны шматлікімі крытыкамі, сярод якіх — аўтары вядомыя і менш вядомыя, але аб'ядноўвае іх тое, што яны зацікаўлены яе творчасцю, плённай працай на ніве беларускага і рускага пабрацімства. Называць нікога не буду, бо пішучыя людзі — брацця крыўдлівая. Гэта відаць хоць бы па тым, што ёсць такія, хто, выступаючы ў друку, жадае, каб пералічвалі ўсе іх рэгаліі. Спынюся толькі на трох імёнах.

Наталля Саветная шмат разважае пра творчасць Віталя Сіненкі, у прыватнасці, пра яго раман «Я не забіты пада Ржэвам», звязваючы падзеі, якія адбываюцца ў ім, з тым, што дзеецца ў свеце сёння. Не адзін матэрыял прысвечаны ёю і паэту Ігару Грыгор'еву, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца такія ўнікальныя факты, якія тычацца яго змагання з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, — хоць садзіся і пішы дакументальна-мастацкую аповесць.

Пастаянна цікавіцца творчасцю Наталлі Саветнай і Генадзь Пацыенка, як, дарэчы, і яна — створаным ім. Часта ў друку дзеляцца ўражаннямі аб тым, што з'явілася ў таварыша па пяры. Гэта, безумоўна, не тое, што патрапляе пад выраз Івана Крылова — зязюля хваліць пеўня за тое, што ён хваліць яе. За меркаваннямі — галоўнае, аб'ектыўнымі — ацэнка напісанага. На гэтую зацікаўленасць уплывае і тое, што абодва цесна павязаны са сваёй малой радзімай.

Наталля Віктараўна жыцця не ўяўляе без Гарадка, а Генадзь Пацыенка шмат працаваў у Маскве. Выкладаў у Літаратурным інстытуце імя А. М. Горкага, працаваў у рэдакцыі «Роман-газеты», апошнія трыццаць гадоў большую частку жыцця праводзіць у вёсцы Зубакі Лёзненскага раёна. Любуецца хараством возера Шэлехава, плёскат хваль якога памятае з маленства, а вярнуўшыся дамоў, шмат чытае. Ніколі не абмінае і кніг Наталлі Саветнай. Хораша адгукнуўся ён пра зборнік «Затаённое слово» ў рэцэнзіі «Свечка на падаконніку». Гэта кніга, «аповесці і апавяданні якой напісаны па ўспамінах відавочцаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай. (…) Задума аўтара ўвянчалася поспехам. Цікаўным даследчыкам час яшчэ адкрые шмат паралеляў ваеннага часу і сучаснасці, якія патрабуюць сур'ёзнага асэнсавання. Аўтар кнігі "Затаённое слово" зрабіла гэта першай. Запаліла на падаконніку свечку, да святла якой пацягнуцца людзі».

Не абышоў Генадзь Пацыенка і кнігу «Одна судьба», у якой сабраны «артыкулы, нарысы, нататкі аб літаратуры, культуры, мове і душы». Няцяжка заўважыць, што «Зеркало» — гэта другая літаратуразнаўчая кніга Н. Саветнай. Больш аб'ёмная не так па велічыні, хоць і гэта відавочна, як па колькасці прадстаўленых імёнаў тых, хто не толькі разглядае творчасць Наталлі Віктараўны, а і разважае аб літаратуры ўвогуле, аб сувязі яе з грамадствам і, што не менш важна, закранае важныя праблемы жыцця і, як ужо гаварылася, з мінулым і сённяшнім, а калі дакладней — з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і тым, што адбываецца ў свеце сёння.

Пра гэта гаворыць не толькі сама Наталля Саветная, але і тыя, хто аналізуе яе творчасць. Прычым назіраецца з'ява, на якую і звярнуў увагу Генадзь Пацыенка. Пералічыўшы некаторыя прозвішчы, сабраныя пад адной вокладкай, а ў «Зеркале» іх куды больш, чым у папярэдняй кнізе, ён заўважае, што тым самым стварыўся своеасаблівы «запаведнік Дабра»: «Пасля прачытання кнігі (маецца на ўвазе «Затаённое слово», але для «Зеркала» гэта характэрна ў большай ступені. — **Н. Р.**) узнікае адчуванне сустрэчы з блізкімі людзьмі. Быццам сустрэўся з імі на вялікай дарожнай развілцы, што разбеглася, і так шкада развітвацца. І адчуваеш, што напоўніўся новымі ўражаннямі, узбагаціўся душой. Так бывае, калі ў вялікую раку ўпадаюць ручайкі, рачулкі, і яна становіцца яшчэ больш паўнаводная».

Навум РУДЭНКА

Край духоўнасці і гармоніі

Кніжная серыя «Мая Воранаўшчына», якая ўжо складаецца з трох кніг, пакуль што не выклікала шырокага розгаласу. Аддрукавана ў Лідскай друкарні. Тыраж невялікі — 100—200 экзэмпляраў. Аўтары і ўкладальнікі жывуць не ў сталіцы. Але кніжная серыя, што пачалася з фальклорнага зборніка, валодае нечым прыцягальным. Найперш — той шчырасцю, з якой выкладаюць свае думкі ў мастацкіх творах аўтары, якія жывуць, працуюць, вучацца ў Воранаўскім раёне. А яшчэ прыцягвае апантанасць, уласцівая іх апавяданням, вершам, нарысам, што так ці іначай становяцца адлюстраваннем роднага і блізкага.

Перад вачыма — другая і трэцяя кнігі серыі: «Воранаўшчына эпічная: Зборнік празаічных твораў педагогаў і вучняў Воранаўскага раёна» і «Воранаўшчына лірычная: Зборнік вершаў педагогаў і вучняў Воранаўскага раёна». У прадмове да першай з іх кандыдаты філалагічных навук, дацэнты кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Руслан Казлоўскі, Аліна Сабуць заўважаюць наступнае: «Воранаўскі раён характарызуецца высокім творчым патэнцыялам сваіх жыхароў, сярод якіх ёсць не толькі аматары паэзіі, але і мастацкай прозы. Гэта людзі неабыякавыя да жыцця, чуллівыя, патрыятычныя, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. На літаратурнай карце Гродзеншчыны воранаўская пісьменніцкая дзялянка закаласавала і плеядай таленавітых пісьменнікаў, і адметнай пераемнасцю творчых стасункаў педагогаў і вучняў. У зборніку "Воранаўшчына эпічная" змешчаны апавяданні, эсэ, лірычныя мініяцюры ў прозе, літаратурныя казкі, нарысы і нават хроніка з пагадовымі запісамі. Ахоплены шырокі дыяпазон тэматыкі: ад патрыятычнай і гістарычнай тэм да тэмы маральнага выбару. Абраная творцамі эпічная форма дазваляе чытачу заўважыць не толькі апавядаемае, але і аўтара-апавядальніка, яго манеру бачыць і ўспрымаць навакольнае асяроддзе, яго склад розуму і пачуццёвую сферу. Аблічча пісьменніка выяўляецца і ў адкрытых маналогах, і ў вольным аповедзе пра край, пра яго людзей, пра іх працу і подзвігі, святы і будні, радасці і гора. Прыгажосць воранаўскай зямлі спасцігаецца скрозь лад узвышаных думак яго творцаў, іх перажыванняў і меркаванняў».

Кнігі серыі «Мая Воранаўшчына» смела можна назваць бібліятэкай літаратурнага, патрыятычнага выхавання. Асабліва хацелася б параіць усім прачытаць нарыс Наталлі Якжык «Мая Воранаўшчына». Змест яго тлумачыць кароткае ўступнае слова, дзе аўтар задаецца пытаннем: «Які ён, Воранаўскі край?..» Наталля Якжык запрашае ў падарожжа па родных мясцінах. Асобныя раздзелы — адрасы адметных, цікавых гістарычных, знакавых у лёсе і воранаўскай прасторы, і Гродзеншчыны, і ўсёй нашай Беларусі мясцін: «Край рамантыкі» — аграгарадок Больцінкі, дом-сядзіба Путкамераў («Парк памятае Марылю Верашчаку, прыгожую і руплівую гаспадыню, каханую Адама Міцкевіча, нашага земляка, класіка польскай літаратуры…»); «Край гераізму» — Шаўры, ваколіцы Начы, мясціна, дзе фарміраваўся атрад Тэадора Нарбута; «Край асветы» — пра Радунь, школьны музей «Валуны крутых дарог мінуўшчыны»; «Край загадак і таямніц» — вандроўка ў Гайцюнішкі і Канвелішкі; «Край духоўнасці» — пра касцёлы ў паселішчах Тракелі і Асава; «Край мужнасці» — пра старонкі ваеннай гісторыі аграгарадка Пагародна і ваколіц… А ў нарысе Наталлі Якжык — і іншыя адметныя адрасы Воранаўшчыны. Як мне падаецца, «Мая Воранаўшчына» дасведчанага аўтара магла б стаць даволі прывабным асобным кніжным выданнем. У мінскім выдавецтве «Беларусь» некалькі гадоў запар выдаецца серыя «Падарожжа па родным краі». Пад яе пазнакай выйшлі цікавыя кнігі Ігара Пракаповіча, Алеся Марціновіча, Сяргея Галоўкі, іншых вядомых краязнаўцаў краіны. Чаму б выдавецтву не звярнуцца да Наталлі Віктараўны Якжык, якая працуе дырэктарам «Навучальна-педагагічнага комплекса Канвелішскія яслі-сад-сярэдняя школа» Воранаўскага раёна, з прапановай зрабіць краязнаўчую кнігу і пра Воранаўшчыну?

У «Воранаўшчыны эпічнай» — 12 аўтараў. У зборніку «Воранаўшчына лірычная» прадстаўлены вершы 18 паэтаў. Прыемна поруч бачыць плён мастацкай працы настаўнікаў і вучняў. Высокую ацэнку даюць паэтычнаму томіку серыі «Мая Воранаўшчына» Руслан Казлоўскі, Аліна Сабуць: «…Сапраўдная паэзія несумяшчальная з шэрасцю і нейтральнасцю мыслення, з адсутнасцю пэўнага эмацыйнага тону. Мова вершаў паэтаў Воранаўскага раёна поўная экспрэсіі, якая становіцца дамінуючым пачаткам. Тут можна заўважыць каларытныя мастацкія тропы і своеадметную мастацкую вобразнасць. Край легенд і паданняў, край ваяроў і аратых, край старадаўніх традыцый, вельмі старажытны і вельмі сучасны — такой прадстане Воранаўшчына перад чытачом».

У серыі, заснаванай у 2022 годзе, ёсць рэдакцыйны савет. У яго ўваходзяць Н. Якжык, Н. Адамчык, Г. Янушка. Зборнікі выдадзены з удзелам Воранаўскага раённага выканаўчага камітэта пры фінансавай падтрымцы КСУП «Больцішкі». Такі прыклад шанавання мастацкага слова, прыклад спрыяння развіццю літаратурных талентаў у рэгіёне проста ўражвае!..

Мікола БЕРЛЕЖ

«Хваробы росту»

ЦК КПБ пільна ўглядаўся, якая моладзь ішла ў вялікую літаратуру ў 1960-я… Сярод іншых дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія маюць дачыненне да літаратурнага працэсу мінулых дзесяцігоддзяў, сярэдзіны XX стагоддзя, увагу прыцягвае і вось гэтая даведка ці дакладная запіска… Адрасаваная сакратару ЦК КП Беларусі таварышу Мазураву К. Т. (з 28 ліпеня 1956 да 30 сакавіка 1965 г. — Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі), яна носіць даволі канкрэтную назву, якая адразу ўводзіць, што называецца, «у тэму»: «Аб рабоце партыйнай арганізацыі Саюза Пісьменнікаў БССР». Датавана 23 лютага 1963 года… Хто яе аўтары — можна толькі здагадвацца. Але ж не гэта нават галоўнае. Хто б ні стаяў за самім тэкстам — інакшым ён наўрад ці быў бы.

Напрыканцы 1950-х — у пачатку 1960-х гг. савецкая літаратура «ўздыхнула» на поўныя грудзі. Ці ў любым выпадку — паспрабавала дыхаць напоўніцу… Мяркуйце па імёнах і творах рускай і ўвогуле савецкай літаратуры, якія сталі вядомымі шырокаму чытачу ў тыя гады… У 1956 годзе выходзіць раман Уладзіміра Дудзінцава «Не хлебам адзіным». А яшчэ раней, у 1954 годзе, часопіс «Знамя» друкуе аповесць Ільі Эрэнбурга «Адліга», якая і дала назву цэламу дзесяцігоддзю… Надрукаваны аповесці пісьменнікаў-франтавікоў Юрыя Бондарава, Рыгора Бакланава, а таксама творы беларускага празаіка Васіля Быкава — «Жураўліны крык» (1961), «Трэцяя ракета» (1962). Выдаюцца найлепшыя зборнікі вершаў паэтаў франтавога пакалення — Барыса Слуцкага, Аляксандра Межырава, Яўгена Вінакурава, Давіда Самойлава… 11 верасня 1955 года ў Маскве прайшоў першы Дзень паэзіі. Паэты выйшлі на пляцоўкі вялікіх палацаў культуры, на стадыёны, чыталі вершы ў кнігарнях. У 1958 годзе за раман «Доктар Жывага», надрукаваны за межамі СССР, Барысу Пастэрнаку прысуджаюць Нобелеўскую прэмію па літаратуры… І разам з тым шмат што не друкавалі, забаранялі, на многія публікацыі абвальваўся шквал аглабельнай крытыкі…

І чамусьці перш-наперш у полі зроку цэкоўскіх работнікаў — літаратурная моладзь. Хаця што тут дзіўнага? Не крытыкаваць жа Петруся Броўку ці Міхася Лынькова, прызнаных майстроў беларускай літаратуры і на той ужо час…

З дакладной запіскі Першаму сакратару: «Мала пісьменнікаў прымае ўдзел у працы секцыі прозы. Пасяджэнні секцыі дэталёва не прадумваюцца, не рыхтуюцца і праходзяць не заўсёды ўдала. Вельмі важным было пасяджэнне секцыі 31 мая 1962 г., на якім стаяла пытанне пра творчасць маладых празаікаў. Аднак гэта пасяджэнне гаворыць толькі пра тое, як нельга арганізоўваць абмеркаванні. За некалькі дзён да пасяджэння ў газеце "Звязда" быў надрукаваны артыкул "Пацяруха" пра кнігу Б. Сачанкі "Барвы ранняй восені". І замест таго, каб сапраўды абмеркаваць творчасць маладых празаікаў, доказна адзначыць, што ў іх творчасці добрага, над чым варта задумацца, усё абмеркаванне звялося да грубага асуджэння артыкула і ўхвалення няўдалых твораў Б. Сачанкі, І. Пташнікава і некаторых іншых маладых пісьменнікаў. Ганебна вялі сябе на гэтым абмеркаванні навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР В. Гапава, Д. Бугаёў, В. Каваленка. Іх дэмагагічныя, крыклівыя выступленні не атрымалі вартага адпору з боку болей сталых пісьменнікаў, якіх, на жаль, на гэтым пасяджэнні было вельмі мала». Калі азірнуцца назад, агледзець усё зробленае ў прозе лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа Барысам Сачанкам, які так заўчасна пайшоў з жыцця, не дасягнуўшы і сваёй 60-й вярсты, то якраз яго першыя кнігі, «Дарога ішла праз лес» і «Барвы ранняй восені», вылучаюцца сваёй свежасцю, цеплынёй, гавораць пра талент пісьменніка, яго арыгінальнасць. І хто ведае, калі б не такога кшталту аглабельнасць, якая была скіравана на творчыя здзяйсненні маладога аўтара, то, магчыма, і іншым, больш плённым быў бы ўвесь яго мастацкі шлях…

«Як секцыя прозы, так і паэзіі ў асноўным займаецца абмеркаваннем творчасці маладых тады ж, калі звяртаюцца з заявамі аб прыёме ў Саюз, — чытаем у дакладной запісцы. — Дарэчы, як відаць з пратаколаў, творы маладых абмяркоўваюць у асноўным маладыя члены секцыі, часам да іх далучаюцца М. Калачынскі, С. Шушкевіч, А. Русецкі, А. Вялюгін. Але бывалі і такія выпадкі, калі, напрыклад, пра вершы У. Ляпёшкіна рабіў даклад А. Дзеружынскі, які нават не з'яўляецца членам Саюза (так, Авяр'яна Дзеружынская прынялі ў СП БССР у 1964 г. — **В. С., К. Л.**). Мяркуем, што было б больш карысці, калі б гэта рабілі старэйшыя і болей вопытныя пісьменнікі і паэты…

Асноўны недахоп у рабоце ўсіх секцый заключаецца ў тым, што яны мала займаюцца сапраўды творчымі праблемамі, слаба вядуць канкрэтную працу па павышэнні якасці мастацкіх твораў…»

Чытаем далей: «…За апошні час у беларускую літаратуру прыйшло нямала таленавітай моладзі, якая сваёй творчасцю звярнула на сябе ўвагу чытачоў і крытыкі. Маладыя пісьменнікі ўсё болей настойліва заяўляюць аб сабе, у іх творах прыкметнае імкненне творча асэнсаваць нашу рэчаіснасць, адлюстраваць тыя вялікія перамены ў нашым грамадстве, якія адбыліся пасля XX з'езда КПСС.

У маладых не толькі бясспрэчныя поспехі, значныя творчыя дасягненні, але ў іх ёсць і свае цяжкасці, свае "хваробы росту". Маладым літаратарам патрэбна пастаянная ўвага як з боку пісьменніцкай арганізацыі, так і з боку друкаваных органаў.

Нельга сказаць, што ў Саюзе пісьменнікаў не цікавяцца творчасцю маладых, што іх творы не выносяцца на абмеркаванне, не разглядаюцца ў творчых секцыях. Нядаўна праведзены адкрыты партыйны сход, на якім асноўная ўвага была звернута на творчасць маладых. Саюзам пісьменнікаў арганізаваны шэраг паездак маладых пісьменнікаў на цаліну, у калгасы і саўгасы рэспублікі.

Аднак сапраўдны аналіз іх творчасці пачынаецца тады, калі кнігі маладых па нейкіх прычынах затрымліваюцца ці бракуюцца ў выдавецтве ці калі на кнігу маладога пісьменніка з'яўляецца адмоўная рэцэнзія. Так здарылася з кнігамі І. Пташнікава "Чакай у далёкіх Грынях", Б. Сачанкі "Барвы ранняй восені".

Не ва ўсіх творчых секцыях аднолькава патрабавальна адносяцца да творчасці маладых пісьменнікаў. У секцыі дзіцячай літаратуры часам без усялякіх на тое падстаў захвальваюцца слабыя ў мастацкім плане творы, якія рэкамендуюцца да выдання.

Партыйная арганізацыя Саюза, яго Праўленне слаба дапамагаюць маладым пісьменнікам сцвярджаць і развіваць тое добрае, што ёсць у іх творчасці, і зусім сціпла гавораць пра недахопы.

Не так даўно на пасяджэнні крытыкі слухалася пытанне пра стан крытыкі ў часопісах "Беларусь" і "Маладосць". На жаль, выступоўцы амаль не краналіся такіх пытанняў, як суб'ектывізм і густаўшчына ў беларускай літаратурнай крытыцы. А такія з'явы яшчэ маюцца. У свой час усе літаратурныя часопісы захлёбваючыся хвалілі першыя кніжкі маладых пісьменнікаў В. Адамчыка і Р. Барадуліна. Несумненна, гэта здольныя людзі, але было б болей карысці, каб гэтыя артыкулы і рэцэнзіі адзначаліся глыбокім і канкрэтным аналізам без лішняга фіміяму…»

Зусім не дзіўна, што крытычныя заўвагі выклікае стаўленне, на шчасце, добрае і разумнае стаўленне старэйшых пісьменнікаў да сапраўды таленавітых Рыгора Барадуліна і Вячаслава Адамчыка… Таленты заўжды прыкметныя, выклікаюць зайздрасць, ды і вырастаюць, фарміруюцца ў асобы, калі самі здольныя крытычна разглядаць рэчаіснасць… Рыгор Барадулін прыблізна ў тыя часіны, калі пісалася дакладная запіска, мо крыху раней, напрыканцы 1950-х, напісаў такую эпіграму:

Аб сабе заяўляе прама:
Не паэт — а сучаснасць сама.
Кожны верш — то яго праграма,
Толькі дзеяння штосьці няма.

І ў дакладной запісцы простай мовай, месцамі — з падтэкстам, інтанацыі скіраваны на галоўнае, на меркаванні, зразумела, работнікаў ЦК, — літаратура павінна «ісці ў нагу з часам»… Толькі, атрымліваецца, самі пісьменнікі абавязаны прыслухоўвацца да дырэктыў, якія каментуюць гэты час, іначай, калі самі аглядаюць час, разважаюць пра яго, то здольны і памыліцца…

Са звароту да Першага Сакратара: «Паўсядзённая, настойлівая творчая вучоба маладых падмяняецца асобнымі мерапрыемствамі, якія пры ўсёй іх каштоўнасці застаюцца хіба што толькі асобнымі мерапрыемствамі.

Маладыя літаратары яшчэ не заўсёды цвёрда ведаюць, на якіх баках нашага жыцця варта засяродзіць увагу, якія людзі, падзеі, канфлікты з'яўляюцца галоўнымі для сённяшняга дня.

Адным з істотных недахопаў у рабоце партыйнай арганізацыі з маладымі пісьменнікамі з'яўляецца і тое, што ёй не ўдаецца яшчэ наладзіць большую творчую повязь паміж пісьменнікамі старэйшага пакалення і маладымі. Пісьменнікі старэйшага пакалення вельмі рэдка выступаюць у друку з рэцэнзіямі па кнігах маладых, не прымаюць удзелу ў рэдагаванні іх кніг.

Газета "ЛіМ" у 1962 годзе ўвяла спецыяльную рубрыку — "Слова пра малодшага сябра". З аналізам творчасці маладых мастакоў і акцёраў выступілі народны мастак БССР З. Азгур, заслужаныя артысты БССР А. Асторына, А. Шкайскі, дырыжор В. Барсаў і г. д. Разам з тым за ўвесь перыяд ніхто са старэйшых і вопытных пісьменнікаў не прыняў удзел у гэтым карысным пачынанні.

Выданні розных гадоў.

Пералічаныя вышэй недахопы ў рабоце з маладымі пісьменнікамі, а таксама адсутнасць вартай патрабавальнасці з боку рэдакцый часопісаў і выдавецтваў прыводзяць да таго, што ў друку з'яўляюцца такія "сачыненні", як "Плыві, мой чоўн" В. Шаціла, "Чакай у далёкіх Грынях" І. Пташнікава, асобныя апавяданні Б. Сачанкі, некаторыя вершы А. Наўроцкага і У. Караткевіча і г. д.

Зніжана патрабавальнасць у апошні час і пры прыёме ў члены Саюза. Не паспее яшчэ выйсці першая кніга, як выдаецца членскі білет. А ўсім жа вядома, што ранняя прафесіяналізацыя карысці не прыносіць, паколькі жыццёвы шлях, які заключаецца ў асноўным у трохкутніку — "школа — інстытут — Саюз", без працоўных навыкаў дае вельмі павярхоўнае веданне жыцця, скоўвае творчыя магчымасці, у некаторых выпадках вядзе да аднабаковай, няправільнай пастаноўкі пытанняў сучаснай рэчаіснасці…

Партарганізацыя Саюза слаба прыцягвае маладых пісьменнікаў да ўдзелу ў грамадскай рабоце, недастаткова сочыць за павышэннем іх палітычнага ўзроўню, не рыхтуе да ўступлення ў члены КПСС…»

І яшчэ: «Ростам партыйных шэрагаў партарганізацыя займалася нездавальняюча, паколькі з 1952 г. у шэрагі членаў КПСС ніхто з пісьменнікаў не прыняты».

Ідаця ў рабоце партыйнай арганізацыі і самой пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі было знойдзена і нешта станоўчае, дакладная запіска Першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі падштурхоўвае да наступнае высновы… Беларуская мастацкая літаратура і ў другой палове 1950-х — на пачатку 1960-х гг. развівалася згодна законам жыцця, законам мастацтва. І з таго часу, з 1961 — 1962 гг., засталіся кнігі, творы, за якія беларускай літаратуры не сорамна… Згадаем хаця б некаторыя. У 1962 г. у пятым-шостым нумарах часопіс «Полымя» друкуе раман Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць». А годам раней у красавіцкім нумары «Полымя» выходзіць аповесць пісьменніка «Раман Ракута», цяпер вядомая пад назвай «Сівая легенда»… Дарэчы, у лютым — 1-га і 26 лютага (дакладная запіска Першаму сакратару датавана 23 лютага 1963 г.) — у «Літаратуры і мастацтве» змешчаны ўрыўкі з рамана «Каласы пад сярпом тваім» і з «Дзікага паляванння караля Стаха»… У 1960 годзе выходзіць кніга апавяданняў Вячаслава Адамчыка «Млечны Шлях». Паступова становіцца відавочным, што чытача болей прыцягвае тое, што характарызуе творчасць праз асабістае, тое, што не нагадвае пра капіяванне, няхай сабе і «ідэйна правільнае» капіяванне… Невыпадкова славуты беларускі празаік Янка Брыль сярод іншых запісаў у 1962 годзе ў «Сваіх старонках: Да творчай біяграфіі» пакідае наступнае назіранне: «Ці сваё, ці чужое, але добра сказаў нядаўна Куляшоў, праслухаўшы верш Караткевіча: "Гэта вельмі асабістае, гэта — здорава!"»

Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,
Кастусь ЛЕШНІЦА

Раіса БАРАВІКОВА

Пяюць дразды

Памяці мужа

У мроіве пялёсткавым сады.
Нашто мне цуд вясновага квітнення?
Абселі голле яблыняў дразды,
а я ні ў чым не бачу суцяшэння.

Прыроды хараство, куды ні глянь!
А я нічым душу сваю не ўзрушу,
нібы накрыў салёны акіян
маю лясную, бэзавую сушу.

Ні сёння, ні ў ніякія разы
былая радасць не агорне болей.
Пяюць, як ачмурэлыя, дразды,
а я маўчу… Пякучы ком у горле.

* * *

Цяпер ужо стала звычкай
глядзець на краёчку
паспелага лета,
як у цемры пабліскваe ў небе
знічка,
бы каханы запальвае цыгарэту…

Назаўжды развяло раздарожжа.
Разумею, што марна чакаць
год за годам,
бо толькі сонца вяртацца можа,
назваўшы вяртанне сваё ўзыходам.

Скрыпач. Мелодыі навальніцы

З хмары выслізнуў вецер і з парывістым
гневам
падхапіў, пакаціў кімсьці кінуты мяч…
Чую гукі, стаю пад грымучай залевай,
падалося, іграе ў захмар'і нябачны
Скрыпач.

Не збягаю, стаю… Ліст каляны і ліпкі
з дрэва ўпаў на шчаку,
захліпнуўся дажджом
небакрай.

Чую ў кроплях дыханне дзівоснай,
таемнае
скрыпкі,
і прашу Скрыпача я: ты іграй,
ты іграй…

Вецер гоніць і гоніць мяч пакінуты
нечы.
Я збяру сёння нервы ў тугі, як ніколі,
пучок.
Ты злуешся, Скрыпач, —
на зямлі калатнеча,
і ў руках тваіх грозна ўзлятае
маланкай
смычок.

Ён праніжа паўнеба,
перамовіцца похапкам
з громам,
дождж шуміць — ці то стогн,
ці то чуецца
плач…
Дарагі мой Скрыпач, ты не ведаеш
стомы,
дык іграй і хоць трошачкі штосьці
ў гэтым свеце зынач…

На забытай сядзібе

Рэха вярнулася колішнім спевам,
пераадолела цемру прадоння,
з семені вырасла новае дрэва
і не пазнала роднага ўлоння…

Зарос падмурак, дзе была хата,
лапік чабору аблашчу рукамі —
і, як пагляд апошняга сармата,
праткне душу счарнелы ў часе
камень.

Накід у сінім колеры

На свежым золку — сіне-сіне…
Рака сінечаю дыхне.
І ў той сінечы бераг гіне,
няма за што ўчапіцца мне.

Наўкол туман, што сіні іней.
Калеюць вербы ў сіняве.
І качачка ў той сіняй стыні
ў бяздонне сіняе плыве…

У Белаазёрску

Са згадак пра Ніну Мацяш

Усё часцей вяртаюцца ўспаміны.
Ужо хмызняк за Нівамі галеў.
Спявалася так добра нам у Ніны,
антонаўкі ляжалі на стале…

Бадзяўся вецер па завулках
дзёрзка,
а ноччу лашчыў яблынек галіны…
І чуўся пошум над Белаазёрскам,
нібы чыталі травы вершы Ніны.

Алена ВЯЧЭРСКАЯ

* * *

Я так люблю цябе, восень!
З табой падабенства маю:
І дні мае ветрам зносіць,
І сумныя думкі згрызаюць…
А неба тваё так нізка,
Бліжэй, чым уся зямля…
Караляў рабінавых нізка
Свіціцца… Эміль Заля
Дагэтуль не прачытаны —
Пачну, можа, дні праз тры…
Мой крыж залаты вышываны
Лістотаю на вятры,
Зоркай на ўсходзе кожнай,
Музыкай соннай глушы…
Восень, табе так самотна,
Але не прашу: «Напішы!..»

* * *

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Яшчэ гучыць струна тваёй гітары —
І лёгка ў вышыню ўзлятаюць пары
Слоў, закаханых лебедзяў, глядзі!

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Яшчэ ляціць магутна і імкліва,
Як гукі струнаў, звонкі летні лівень
На ноты ніў зялёных, маладых.

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Яшчэ з прасторы,
вечарам адкрытай,
Нам зорнае святло спускае крылы
І абдымае музыку вады…

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Яшчэ светла-цяністая завеса
Сцішае акіян бурлівы бэзу
І пырскі ловіць павучковы скіт.

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Яшчэ вятры сваю тугу шпурляюць
На дрот слупоў, ды іх не заўважаюць,
Спяшаюць да надзеі цягнікі.

Яшчэ не ўсё прапала, сябра мой!
Хай шмат шляхоў прыпынена
нібыта,
Душой прамень вясновы не забыты,
Жыццё пульсуе ў лініях рукі…

Захоўвае душа

Душы захоўваць сум часоў былых,
Страх будучых,
Шукаць з табой сустрэчы.
Пагібелі чакае кожны міг,
І кожны крок аплакаць мусіць вецер.
На кветцы кропляў восеньскіх уздрыг,
Як музыка, што ў нотах лёс пакінуў,
Зрываецца мне на далонь згары,
Нібыта плача па былых вышынях.
Як дзіўна, што разлучыць нас
не смерць,
Жыццё радком сарвецца,
роўным болю, —
Завершыць недапісаны свой верш
Асенняй кропляй слёз на мацыёле.

Дарожная песня

Не сумуй, безумоўна, я з'еду.
Неба скончыць блукаць між снягоў
І па слёзным замеценым следзе
Верне ўсё да сваіх берагоў.

Дрэў галіны пра літасць не моляць,
Не адчуць ім паверхняй кары,
Як у просіні зяблай зімовай
Стук сякеры пранік праз вятры.

Не сарвецца слязою на глебу
Голас гэтых стамлёных вятроў…
Пра былое тлумачыць не трэба.
Не сумуй, зразумею без слоў.

Адгуляла зіма ў снегавеі
І ля вогнішча сцішыць свой бег.
Не сумуй… Шкадаванням не веру…
Проста мне час вяртацца прыспеў.

Проста дзесьці слязой нетутэйшай
Праліваецца сонца на снег,
Час адвечнай вясновае песняй
Лёд зрывае з няскораных рэк.

Проста міг назаўсёды спавіўся
Той гаючай пяшчотаю сноў
І світальным агнём азарыўся…
Боль мінуў, засталася Любоў.

Пераклад з рускай
Міколы КАНДРАТАВА

Марына ШАДУЯ

Асілкі-дубы

Бясконцасць нябёсаў кранаюць сваім
галлём,
Шапочуць пра нешта вятрам уначы,
а ранкам
Жаўрук заспявае паблізу з такім
пачуццём,
Што лісце сарвецца і ў танцы
кружляе над ганкам.

І будуць асілкі-дубы, як за дзецьмі,
сачыць
За тымі лістамі і вокнамі бацькавай
хаты,
Усмешкі і крыўды ўсе нашы ўпотай
лічыць,
А імі любое дзяцінства заўсёды багата.

І будзе матуля ціхутка спяваць
Ды смажыць аладкі, каб дзеці раслі
ў згодзе
З сабою, людзьмі, каб умелі яны
шанаваць
Асілкі-дубы, па небе галлём
што водзяць.

І будзе так многа напярэдзе сонечных
дзён,
Бацькоўскай пяшчотай,
як шалем пуховым,
сагрэтых.

Дубы каля хаты забралі ў салодкі палон
Усе мае сны. Ім дзякуй вялікі за гэта.

* * *

Калі ласка, квіток да прыпынку
«ДЗЯЦІНСТВА».
Грошай мне не шкада.
Колькі трэба, скажы?
Там рамонкі на лузе, маёй маці хусцінка
Калываюцца з ветрам... То мае міражы.

Там зімой на падворку снег блішчыць
на марозе
І здаецца жывым у двары снегавік.
Там аб нечым шапоча з грушай дуб
пры дарозе.
У бясконцай прасторы смутак цалкам
мой знік.

Лужа там нібы мора, і ніякіх памылак
За плячыма. І крыўд не гуртуецца раць.
Мне квіток да «Дзяцінства»!
Што, у вас перапынак?
Ну, нічога. Не к спеху. Я магу пачакаць.

Фота Кастуся Дробава.

Аскепкі памяці-2

Абразкі

Тамара БУНТА

Што рабіць з аскепкамі памяці — сваёй і чужой? Бабуля расказвала, мама расказвала, бацька расказваў, выпадковы чалавек у цягніку расказваў… Многіх з іх ужо даўно няма на гэтым свеце, а гісторыі засталіся. Да іх дадаюцца тыя, якія захоўваюцца ў розных закутках маёй памяці, часам далёкіх і патаемных. Цяпер усе яны жывуць у маёй душы. Жывуць, пакуль я жывая. Мусіць, трэба пераказаць іх вам…

Рукавы

Мама расказвала…

Калі мая бабуля Рыпіна ішла замуж, то яе маці, мая прабабуля, разам з пасагам дала ёй вышываныя рукавы сваёй святочнай кашулі, якія яна, у сваю чаргу, атрымала разам з пасагам ад маёй прапрабабулі. Мама казала, што тыя рукавы, старанна і прыгожа вышытыя адметным узорам ад плячэй і да запясця, цаніліся самі па сабе і перашываліся з адной кашулі на другую: тканіна на грудзях і спіне зношвалася, яе адпорвалі і ставілі новую — да рукавоў.

Але рукавы перадаваліся з пакалення ў пакаленне не толькі як вялікая каштоўнасць: у мамінай мясцовасці, на Мсціслаўшчыне, сярод сялян быў такі звычай — пасля першай шлюбнай ночы, калі маладая была цнатлівая, то ёй у вышываныя рукавы свякроўка насыпала цукерак і пернікаў, а калі нявеста была «нячэсная» — ёй у гэтыя рукавы накладвалі каровіных праснакоў. Мая бабуля атрымала цукеркі…

На жаль, тыя цуда-рукавы згарэлі ў вайну разам з бабулінай хатай. А хацелася б хоць адным вокам глянуць на іх, ужо не кажучы пра тое, каб атрымаць у пасаг, а потым перадаць сваім дочкам як сямейную рэліквію…

Самы жвавы

Мама расказвала…

Напрыканцы дваццатых гадоў у суседнім сяле камсамольцы разбуралі царкву. Скінулі звон, выкінулі з храма абразы.

Збегліся людзі. Старыя стаяць, плачуць, просяць:

— Хлопчыкі, не разбурайце! Пабойцеся Бога — ён усё бачыць!

А хлопцы смяюцца са старых, быццам з дурных. Адзін, самы жвавы, кажа:

— Ды што там ваш Бог бачыць? Во, глядзіце!..

Узяў і нажом выразаў вочы Хрысту на абразе.

Неўзабаве той дзяцюк ажаніўся. Праз час яго жонка нарадзіла дачушку. А дзяўчынка — сляпая! Тут усе і прыпомнілі няшчаснаму бацьку, як ён Хрысту на абразе вочы нажом выразаў.

Не вытрываў хлопец, кінуў жонку з дзіцем і з'ехаў кудысьці…

Шыфер

Бацька расказваў…

У іх вёсцы жыла старая жанчына, Марыля. Нядоўгі час яна працавала кухаркай у доме Сяргея Прытыцкага, калі той узначальваў Маладзечанскі абкам партыі. Калісьці яе муж-нябожчык разам з Прытыцкім быў на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Вось і даверылі.

Марыля жыла адна, у старой хаце, пабудаванай «яшчэ да палякаў». І дах на яе хаце таксама быў стары і дзіравы, таму ў непагадзь жанчына гаравала ад дажджу.

Купіць жа шыфер не магла — у той час гэта быў страшэнны дэфіцыт. Каб набыць яго, запісваліся ў чаргу на лесагандлёвым складзе і потым доўга чакалі, пакуль тавар прывязуць. А запісацца ў тую чаргу можна было толькі з дазволу галоўнага гарадскога ці раённага архітэктара на будоўлю новай хаты. Таму дапрасіцца шыферу старой вясковай жанчыне, якая не будавалася, было цяжка, амаль немагчыма.

І вось Марыля ездзіла з паклонамі да раённага начальства, ездзіла, а потым і гаворыць:

— Ну ўсё, паеду заўтра ў Мінск, у цэка, і паскарджуся на вас! Я самога Прытыцкага карміла! Сяргей Восіпавіч заўсёды еў мае стравы і дзякаваў, а цяпер, на старасці гадоў, мне аніякай пашаны!

І хто яе падвучыў так прыстрашыць? Аднак у райцэнтры толькі пасмяяліся са старой як з дурной: ну дзе той ЦК КПБ і дзе яна!..

Назаўтра Марыля ўстала рана-раненька. Пешшу дайшла са сваёй вёскі да Беніцы, адтуль першым аўтобусам паехала ў Маладзечна, там села на электрычку і праз дзве гадзіны была ў Мінску.

Мусіць, гэта быў яе дзень — усё спрыяла старой. На сталічным вакзале яна запытала ў строгага, але ўважлівага міліцыянера:

— Дзе тут цэка, куды народу можна паскардзіцца на несправядлівасць?..

І міліцыянер спакойна патлумачыў ёй, на якім аўтобусе трэба ехаць да будынка ЦК КПБ.

На прыступках вялікага дома з высокімі дзвярыма Марылю прыпыніў яшчэ адзін строгі, але ўважлівы міліцыянер і цярпліва выслухаў расповед пра тое, як яна калісьці працавала кухаркай у доме Прытыцкага, як гатавала яму смачныя стравы і як Сяргей Восіпавіч еў і хваліў іх, еў і дзякаваў... А цяпер ёй у раёне шыферу не хочуць выпісаць! Вось з-за гэтай несправядлівасці яна і прыехала ў цэка, каб разабраліся.

Унутр вялікага дома міліцыянер яе не пусціў, аднак паклікаў адтуль маладжавага чалавека ў строгім гарнітуры і пры гальштуку. Той таксама пачаў распытваць старую. Пакуль Марыля пераказвала сваю гісторыю наноў, маладжавы чалавек хуценька запісваў яе расповед у невялікі нататнік.

— Надта дзякаваў мне Сяргей Восіпавіч за смачныя стравы! — падкрэслівала Марыля сваю заслугу перад партыяй. — Еў і хваліў! Еў і хваліў!

— Добра, — прамовіў маладжавы чалавек, хаваючы нататнік у кішэню. — Едзьце дадому — ваша пытанне будзе вырашана!

— Як? — не паверыла Марыля, яна ж нават яшчэ ў цэка не зайшла!..

Старая баялася: калі і тут ад яе адмахнуцца, прыйдзецца гараваць з дзіравым дахам ажно да смерці.

— Станоўча! — адказаў маладжавы чалавек і пайшоў за высокія, моцныя дзверы.

Марыля не зразумела ягонага адказу, але адчула, што ён прамовіў нешта важнае, слушнае.

Па сталіцы старая не бадзялася — навошта тая ёй, ды і заблукаць баялася ў вялікім горадзе. Адразу паехала на вакзал і праз дзве гадзіны была ў Маладзечне. На кірмаш не пайшла — запозна. У краме каля аўтастанцыі купіла чатыры боханы хлеба, сабе і парсюку, і колца ліверкі. Потым села ў аўтобус да Беніцы, а стуль прывычна пайшла дадому пешшу, быццам і не стамілася…

Калі Марыля прыйшла да сваёй хаты, на падворку ляжаў прыгожы стос новага, бялюткага, чысценькага шыферу.

— От як Сяргей Восіпавіч мяне цаніў! — хвалілася яна потым па ўсёй вёсцы. — Нават і ў цэка пра гэта ведаюць!

Сама ж Марыля не ведала, што, пакуль яна ехала ў электрычцы, з ЦК КПБ патэлефанавалі ў Маладзечанскі райкам партыі і загадалі, каб заслужанай працаўніцы сельскай гаспадаркі выпісалі шыфер. А пакуль старая купляла ліверку ў краме, а потым трэслася ў перапоўненым ЛАЗе дадому, ёй у вёску прыпёрлі ўжо на машыне шыфер. І толькі таму, што ў раён патэлефанавалі з самога ЦК!.. А пра заслугі перад партыяй — ні ейныя, ні яе мужа-нябожчыка — ніхто і не пацікавіўся.

Чырвонае яйка

На Вялікдзень сама прыгадала…

У школьныя гады была ў нас адна забаўка — у Велікодную ноч хадзіць на царкоўную службу, але не маліцца, а пільнаваць нашых настаўнікаў, якія прыходзілі да царквы пільнаваць нас: маўляў, ці не пайшлі піянеры і камсамольцы ў храм разам са сваімі бацькамі?..

Напярэдадні Вялікадня, увечары, гадзін у дзесяць, старэйшыя хлопцы і дзяўчаты з нашага завулка збіраліся і вясёлым гуртом накіроўваліся ў бок гарадской царквы. Ну, і меншая дзятва бегла за імі ўслед.

Гуртаваліся, па-першае, каб было не так страшна ісці па пустых, цёмных, не заўсёды асветленых ліхтарамі вуліцах, а па-другое, каб было з кім пасмяяцца з настаўнікаў, якіх дырэктар штогод прымушаў гнаць дадому недарэчных вучняў.

Звычайна мы выходзілі на ўскрай старой брукаванай плошчы, дзе стаяла царква, хаваліся там за дрэвамі або за вуглом двухпавярховага, яшчэ дарэвалюцыйнай пабудовы, дома і вышуквалі ў натоўпе знаёмыя постаці.

Калі пазнавалі сваіх настаўнікаў, весяліліся: мы іх бачым, а яны нас — не! Стаялі, назіралі ды пасмейваліся з таго, як тыя тупаюць на адным месцы і дарэмна круцяць галовамі па баках. Аднак чапацца з імі ніхто не збіраўся. Ведалі, што неўзабаве пойдзем дадому спаць, а настаўнікі будуць мерзнуць тут усю ноч. І мы, дурныя, радаваліся гэтаму…

Святкаваць рэлігійныя святы ў той час было забаронена. За велікоднае яйка, прынесенае ў клас, маглі выгнаць калі не з піянераў, то з урока дакладна. Такая гісторыя аднойчы здарылася ў нашай школе.

Пасля Вялікадня сямікласнік Санька Сініцкі на ўроку фізікі дастаў з партфеля чырвонае яйка і пачаў гуляцца з ім.

Трэба зазначыць, што хлопец быў вялікім неслухам і настаўнікаў не надта баяўся. Яго бацькі развяліся, а ў той час гэта было рэдкасцю. Таму ў школе ніхто не здзіўляўся, што хлопец расце лайдаком і невукам.

— Хрыстос уваскрос! — гучным шэптам паўтараў Санька і прыдурліва хрысціў лоб.

Аднакласнікі наўкол яго пераглядваліся і спадцішка пасмейваліся.

Аднак «фізіца» не пацярпела такога дурасліўства на ўроку: адабрала ў хлопца чырвонае яйка і храснула яго аб Санькаў лоб, расціснула, а потым расцерла па ўсім твары.

Яйка было зварана ўсмятку, і вадкі жаўток запэцкаў лоб, нос, шчокі хлопца, а таксама пальцы настаўніцы.

— Вось табе — Хрыстос уваскрос! А вось табе — сапраўды ўваскрос! — прамовіла «фізіца» і выцерла далонь аб белую кашулю вучня. — А цяпер прэч з класа, парсюк!

Калі Санька выходзіў з класа, ніхто з яго аднакласнікаў ужо не смяяўся.

— Вас Бог пакарае! — дзёрзка прамовіў хлопец наперакор настаўніцы, хаця сам ледзь стрымліваў слёзы пасля абразы.

Аднак «фізіца» добра ведала свой прадмет выкладання.

— Ніякага Бога няма! — строгім голасам абвясціла яна сцішаным вучням. — У свеце ўсё адбываецца па законах фізікі. Прадметам фізікі з'яўляецца матэрыя, якая існуе вакол нас. Тое, што можна памацаць рукамі. А Бога нельга памацаць рукамі, значыць, ён не існуе! Зразумелі?..

…Праз трыццаць гадоў я стала часта заходзіць у тую самую царкву на старой плошчы ў маім родным горадзе: памінала маці-нябожчыцу.

У выходныя я прыязджала са сталіцы ў апусцелы мамін дом, у суботу хадзіла на могілкі, а ў нядзелю ішла ў царкву. Я ўжо ведала, што яна называецца Свята-Пакроўскай, што ёй больш за сто гадоў і што за ўвесь час свайго існавання царква ніколі не была зачынена. Як кажуць, намоленае месца. Раней гэта ўсё мне было нецікава…

Аднойчы пасля імшы нехта аклікнуў мяне на цвінтары. Я з радасцю пазнала сваю былую класную кіраўніцу. Сустрэчы каля храма я не здзівілася — ужо чула ад былых аднакласнікаў, што наша «класуха», гэта вытанчаная школьная «французанка», заканадаўца тагачаснай моды, стала шчырай праваслаўнай верніцай. Мы крыху пагаманілі з ёю, успомнілі вучняў нашага класа — хто дзе цяпер…

Мая класная кіраўніца была не адна, побач з ёю стаяла ўжо досыць старая, самавітая бабуля ў белай хусцінцы. Яна цярпліва чакала ўсю нашу размову і паблажліва ўсміхалася мне. Твар у яе быў прасветлены, вочы добрыя-добрыя — многія людзі пасля імшы выходзяць з царквы ў такім узнёслым настроі.

— Пачакай, — раптам спахапілася мая класная кіраўніца. — А вось гэтую жанчыну ты пазнаеш?

І тут жа звярнулася да бабулі ў белай хусцінцы:

— А вы пазнаеце сваю былую вучаніцу?

Мы здзіўлена ўтаропіліся адна ў адну. І абедзве ніяк не маглі здагадацца, хто ёсць хто. Час змяніў нас.

Тады мая класная кіраўніца ўрачыста прадставіла нас.

Мы былі ўражаны абедзве. Бабуля — тым, што я з хударлявага, цыбатага дзяўчаці ператварылася ў мажную кабету. А я — тым, што гэта сціплая на выгляд багамолка з прасветленым тварам і добрымі вачыма — тая самая настаўніца фізікі, якая калісьці жорстка расцерла велікоднае яйка па твары свайго вучня.

Вось ужо дзе я не чакала сустрэцца з ёю — каля царквы!..

«Няўжо ўсё ж такі атрымалася намацаць Бога?» — так і карцела запытацца ў яе. Але своечасова прыкусіла язык: я і сама не так даўно прыйшла ў храм і пахрысцілася.

«Зямля-працаўніца ідзе, не вагаецца...»



Пачатак новай дарогі Фаіза

Упершыню вершы вялікага паэта на мове ўрду Фаіза Ахмада Фаіза пабачылі свет асобнай кнігай на рускай мове ў 1960 годзе. Зборнік выйшаў у Маскве. У 1962 годзе мастаку слова была прысуджана Міжнародная Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі». Дарэчы, пакістанскі паэт і жыў некаторы час у сталіцы Савецкага Саюза — з 1979 па 1982 год. Вярнуўся на радзіму незадоўга да сваёй смерці. Напрыканцы жыцця быў намінаваны на Нобелеўскую прэмію. Паэт-змагар, паэт, які красамоўна выклаў філасофію супрацьстаяння злу, і зараз цікавы чытачам розных краін і народаў.

Новую кнігу Фаіза Ахмада Фаіза, «Фаіз», што выйшла ў Маскве ў выдавецтве «Художественная литература», у Саюз пісьменнікаў Беларусі прынёс Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Пакістана ў Рэспубліцы Беларусь Саджад Хайдэр Хан. Малады паэт і перакладчык Рагнед Малахоўскі з ахвотай пагадзіўся пераўвасобіць на беларускую мову некалькі твораў легендарнага паэта. Будзем спадзявацца, што гэтае пачынанне стане трывалым мастом да развіцця беларуска-пакістанскіх літаратурных сувязяў на сучасным этапе.

Кастусь ХАДЫКА

Фаіз Ахмад Фаіз

Жнівень 1952 года[1]

Паглядзі, як пераможна ўладу ўсю бярэ вясна.
І каўнер бутона ружы з нецярпеннем рве вясна.

Яшчэ жоўкне ліст зімовы, а паветра ўсё цяплее,
У садах свае газэлі ўсё смялей пяе вясна.

Цені тут яшчэ начныя. Але снежныя вяршыні
Рдзеюць ярка. З ранкам разам з-за цяснін ідзе вясна.

Брат, няма чаго губляць нам! Ахвяруй усё жыццю ты!
Ва ўрачыстасці навокал поле, сад, народ, вясна.

Хто пакутуе ў вязніцах — ранак волі хай прысніцца.
Ў тым парукай вольны вецер, што з сабой нясе вясна.

О, Фаіз! Няхай пустыня ўсё яшчэ пакуль — пустыня, —
Як чырвоныя цюльпаны, ран крывёй цвіце вясна.

* * *

Цяпер сяброў на свята не збярэш, напэўна,
Але Лахор пустым не назавеш, напэўна.
На вуліцы сустрэць вар'ята нескладана,
Ды дрэнна тут ці ўсім — не разбярэш, напэўна.
І жаласны такі — каханнем апантаны,
Ды што ў яго душы — не прачытаць, напэўна.
Гне стома да зямлі, хутчэй бы сном забыцца,
Ды стуленых вачэй — не разамкнуць, напэўна.
Ці кінуцца ў разгул, ці, можа быць, маліцца?..
Як жыць табе цяпер — не зразумець, напэўна.

Так не бывае

Каханне не вернеш сілком — так не бывае.
За ідалам пойдзеш у храм? Так не бывае.
Крывёю ты можаш сысці, з надзеяй кахання,
Ды жару ў крыві не суняць — так не бывае.
Дарма не спрачайся ўнутры з узнесеным сэрцам.
Не зведаць кахання сакрэт — так не бывае.
Караешся смерцю ўсю ноч — світанку чакаеш,
Ды днём ад сябе не ўцячэш — так не бывае.
Узыдуць сусветы й памруць, стагоддзі мільгаюць.
Каханне ты ўсё ж не заб'еш — так не бывае.

Прывал у дарозе

Век мэта — спадарожніца ў шляхах,
Яе забудзеш — марным стане рух.
Душы люстэрка як мутнее ад расколінак бяды,
Разбі яго — і каламута тая знікне, як у снах.

* * *

Тваю прыгажосць я сёння пранёс у гарачым паглядзе,
І яркім тваім уборам навокал мяне ўсё заззяла.
Прымчаўся вецер: як бачна, у спальню тваю праслізнуў ён.
І раніца сёння пахне, як цела тваё маладое.

* * *

Вярнуўся ўночы вобраз твой з душы глыбіняў,
Бязлюдны стэп нібы ахутаў дух вясновы,
Нібыта свежасцю павеяла ў пустыні,
Нібы раптоўнае ў хваробы вылячэнне.

З урду. Пераклад Рагнеда МАЛАХОЎСКАГА

[1] У жніўні 1947 г. была абвешчана незалежнасць Пакістана і Індыі. Верш прысвечаны ўгодкам гэтай даты.

Жанчына і Радзіма

Фахміда Рыяз — пакістанская пісьменніца, якая сёння стаіць у шэрагу самых выбітных літаратараў гэтай краіны.

Нарадзілася Фахміда Рыяз 28 ліпеня 1946 года ў літаратурнай сям'і. У дзяцінстве вывучала літаратуру на ўрду і сіндхі, персідскую мову. Пасля заканчэння каледжа працавала на Радыё Пакістана. У першым замужжы некаторы час жыла ў Вялікабрытаніі, дзе працавала на радыё «BBC» («Бі-Бі-Сі»). Вярнуўшыся ў Пакістан, пачала выдаваць уласны часопіс «Аваз» («Голас»).

Фахміда Рыяз — аўтар 15 кніг паэзіі ды прозы, перакладчыца з сіндхі на ўрду твораў Шаха Абдул Лаціфа Бхітая і Шэйха Аяза.

Вершы Фахміды Рыяз вырваліся з межаў і забарон «правільнай» жаночай паэзіі, якія існавалі ў той час на яе радзіме. «Жанчына мае права пісаць любоўныя вершы, як і мужчына, і гэта не павінна лічыцца амаральным», — гаварыла пісьменніца. Але адначасова з адвагай у вершах Фахміды прасочваецца лірычнасць, вытанчанасць і далікатнасць.

Пісьменніца заўсёды смела выказвала сваю пазіцыю літаратара і грамадзяніна: «Чалавек павінен быць абсалютна шчырым і бескампрамісным у сваёй творчасці. У мастацтве ёсць нешта святое, што не можа быць парушана…»

Шмат вершаў Фахміды Рыяз адлюстроўваюць перыяд знаходжання Пакістана пад уладай генерала Зія-уль-хака. Па грамадзянскім узроўні вершы Рыяз стаяць побач з творамі Назіма Хікмета, Пабла Неруды, Жан-Поля Сартра і Сімоны дэ Бавуар. Ратуючыся ад рэлігійнай тыраніі Зія-уль-хака, Рыяз са сваёй сям'ёй знайшлі прытулак у Індыі.

У Пакістан пісьменніца змагла вярнуцца толькі праз сем гадоў. Некаторы час яна працавала на дзяржслужбе, а пасля стварыла недзяржаўную ўстанову, якая займалася выданнем кніг для дзяцей і жанчын.

Памерла Фахміда Рыяз у Пакістане 21 лістапада 2018 года.

Святлана БЫКАВА

Фахміда Рыяз

Пурва Анчал[1] — Зямля на ўсходзе

(У час каменданцкай гадзіны ва ўсходняй частцы Утар-Прадэш[2])

Зямля — прыгажуня зялёная, родная!
Ляжыш ты ў туманнай смузе.
Лаўлю з цягніка прывітанне пяшчотнае,
Вітаю таксама цябе.
Нібыта сялянка, што з поля вяртаецца
З вузельчыкам на галаве,
Зямля-працаўніца ідзе, не вагаецца —
Ні следу ад ног на траве.

Дадому ідзе… Знікла сцежачка зорная,
Цямнее, святла не стае…
А зграя сцярвятнікаў злосная, чорная
Кружляе над домам яе.
Тут рэшткі мячэці ляжаць мёртвай грудаю[3],
Сляды параслі ўжо травой,
І вочы зямлі — дзве крыніцы гаючыя —
Яе абмываюць слязой…

Ды толькі ўжо Сын на Зямлі абуджаецца,
Той Сын, што мярцвецкім спаў сном.
Прымірыць ён тых, хто на бойку збіраецца
І мір прынясе ў іх дом.

І словы Кабіра[4] разумныя, мудрыя
Напішуцца ў сэрцах наноў:
«Нянавісць і злоба — для Бога няўгодныя,
Ад іх — і пакуты, і кроў.
Ні Рам[5], ні Рахім[6] з неба долу не спусцяцца.
Згоды пакуль не стае,
Покуль любоў, як анёл, не апусціцца
Ў сэрцы, народзе, твае…»

Там, дзе вада лашчыць ціхімі гукамі,
Лотас люляе цяжкі,
За рэчкай Сарджай[7], за гаем бамбукавым
Ціха шапочуць вякі:
«Той, хто ваюе, — ўжо тым пераможаны.
Мір зберажэ толькі мір.
Бо пацярпелым ў вайне будзе кожны —
Ўсіх паглыне чорны вір.
Крокі насустрач, крокі наперад,
Разам, з абодвух бакоў, —
Толькі так сціхне варожасці верад —
Вось запавет мудрацоў
І навучанне Вялікага Буды[8].
Пекла ці ўнутраны рай —
Кожны жыццё сатвараць сваё будзе —
Мір ці вайна — выбірай...»

Мулы[9], пандыты[10] крычаць: «Вайны годзе!
Вер і маліся — жыві!»
Што ж ты кідаешся ў бойкі, народзе,
Тонеш ва ўласнай крыві?..

Глыбокі пацалунак

Глыбокі пацалунак — смак мядзвяны,
Віно кахання, водараў букет!
Ці гэта я, ці свет, напэўна, п'яны?
І ці ён існуе наогул, свет?

Спляліся языкі… І я самлела,
І адчуваю кожнай жылкай я,
Як быццам вылятае лёгка з цела
Дасюль зняволеная ў ім душа мая…

Цалуй мяне, цалуй!.. Смакчу дыханне
З мясцін нязнаных — з глыбіні быцця,
Дзе адбылося першае спатканне
Канца з пачаткам — смерці і жыцця.

Качаюся на цёмным, хісткім мосце:
«Бывай, утульнае маё жытло!..»
Але ж мяняецца, здаецца, штосьці…
Наперадзе праблісквае святло!..

Нітка надзеі

Ноч ізноў запаліла душэўнай паныласці свечку,
У руінах памкненні і мары твае ўсе ляжаць.
І, здаецца, няма больш ні кропелькі сілы адпрэчыць
Цемру мноства начэй і світання аднекуль чакаць.

Сёння ты ў адзіноце, туга шэрым прывідам кружыць…
Але ж нітку надзеі ўтрымаць ты ў руках сваіх змог.
І калі яшчэ здолееш іншых суцешыць, ты — дужы,
І Сусвету прасцяг — ля тваіх, хоць і стомленых, ног!

З урду. Пераклад Святланы БЫКАВАЙ

[1] Пурва Анчал — усходні раён Утар-Прадэш (штат на поўначы Індыі).

[2] Утар-Прадэш — штат на поўначы Індыі.

[3] Маецца на ўвазе мячэць, якую ў 1991 годзе разбурылі фанатычныя індуісты, каб апынуцца на меркаваным месцы нараджэння бога Рама і пасля пабудаваць на гэтым месцы храм у яго гонар (заўв. перакладчыка).

[4] Кабір — сярэдневяковы індыйскі паэт-містык, выбітны рэфарматар руху бхакці, класік літаратуры хіндзі.

[5] Рам — увасабленне індуісцкага бога Вішну, імя Бога наогул. Імёны Рам і Рахім часта ідуць бок у бок як шыфры для артадаксальных уяўленняў пра Бога ў індуізме і ісламе.

[6] Рахім — «Міласэрны» — адно з імёнаў Бога ў ісламе.

[7] Сарджу — назва ракі, на паўночна-ўсходнім баку якой знаходзіцца горад Аёдх'і, дзе ў 1991 годзе фанатычныя індуісты разбурылі мячэць, каб апынуцца на меркаваным месцы нараджэння бога Рама і пасля пабудаваць храм у яго гонар.

[8] Буда — імя Буды Шак'ямунці ці імя аднаго з іншых шматлікіх істот, якія, па ўсходніх вераваннях, дасягнулі прасвятлення.

[9] Мула — мусульманскі святар.

[10] Пандыт — індуісцкі або будыйскі багаслоў.

Маршрутамі Лунінеччыны

Шмат чым запомніўся XXXII Дзень памяці рускага паэта Аляксандра Блока і беларускага даследчыка палескага перыяду яго жыцця Мікалая Калінковіча. З юнымі і дарослымі жыхарамі Лунінецкага раёна сустрэліся нашчадкі Янкі Маўра і Якуба Коласа, а таксама сучасныя літаратары — паслядоўнікі класікаў.

Удзельнікі мерапрыемства ў Лунінцы.

Сінкевічы: мясцовыя стасункі. Гасцей цёпла прыняла старшыня сельсавета Вольга Клеўжыц. Разам прыгадалі і гістарычныя звесткі. Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, які ў 1947 годзе наведаў гэтыя мясціны, выканаў наказ выбаршчыкаў — у вёсцы была пабудавана новая школа. З цягам часу памяшканне стала цесным для дзетвары. У новым трохпавярховым будынку Сінкевіцкай СШ у 1991 годзе стварылі музейны куток у гонар Якуба Коласа. Цяпер жа ў Сінкевіцкім СДК юныя экскурсаводы і настаўнік Ларыса Пятровіч разам з культработнікамі і мясцовым актывам віталі шаноўную дэлегацыю.

Для многіх стала адкрыццём, што Якуб Колас і Янка Маўр былі сватамі. Увагай прысутных авалодала іх унучка — Марыя Міхайлаўна Міцкевіч. Прэзентацыю пра дзеда «па кудзелі» яна прысвяціла 140-годдзю Івана Міхайлавіча Фёдарава, які ў Беларусі па праве лічыцца заснавальнікам і дзіцячай, і фантастычнай, і прыгодніцкай літаратуры.

Вызначылі і «лунінецкі след» у біяграфіі творцы-юбіляра. Захапляючыся мовай эсперанта, Янка Маўр шмат гадоў узначальваў адмысловае таварыства. У 1990-я яго кіраўніком быў Адам Паўлюкавец (з Лунінца) — кніга з яго аўтографам маецца ў хатняй бібліятэцы Марыі Міцкевіч. А сёлета ў лунінецкім урочышчы Мачула адкрыўся помнік ахвярам фашызму — на яго мемарыяльнай дошцы ўвекавечана назва кнігі «Ніколі не забудзем» Янкі Маўра…

Лахва: тут кінулі якар «Палескія рабінзоны». Гаспадар аграсядзібы «Палескія рабінзоны» Ігар Пракаповіч запрасіў пісьменнікаў з Мінска і Брэстчыны з прапановай ушанаваць аўтара папулярнай аповесці, якой захапляецца з дзіцячых гадоў. Марыя Міцкевіч пакінула для аграсядзібы кнігу «Палескія рабінзоны» з аўтографам нашчадкаў Янкі Маўра. Цікавыя выданні ўручылі ўнучка Якуба Коласа Вера Міцкевіч і іншыя госці.

У гонар класіка-юбіляра спяваў пад уласны акампанемент на гітары Сяргей Трахімёнак, чыталі вершы Іна Фралова і Таццяна Дземідовіч, паляўнічыя байкі расказваў Анатоль Брытун.

Лунінец — адметны край. У сярэдняй школе № 2 г. Лунінца намеснік дырэктара Наталля Бойка, а таксама настаўніцы Наталля Харытановіч і Святлана Кузьміч прадставілі праект «Літаратурная Лунінеччына», што створаны разам з рэдакцыяй «Лунінецкіх навін». З пісьменнікамі пазнаёміліся дырэктар Лунінецкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Таццяна Ванюк і ветэран педагагічнай працы Наталля Казанкова (экс-дырэктар краязнаўчага музея, яна працуе ў створанай у ліпені 2022 года Камісіі Саюза пісьменнікаў Беларусі па літаратурнай спадчыне Мікалая Калінковіча).

«Александръ». Вытокі духоўнасці. Наступным днём праграма літаратурнага свята працягнулася ў Лунінецкай дзіцячай бібліятэцы. Тут сабраліся рознаўзроставыя аматары кнігі, якія радасна віталі гасцей. Тыя перадалі каштоўны падарунак — беларускі нумар расійскага літаратурна-гістарычнага часопіса «Александръ» (№ 8—2022), дзе змешчаны і нарыс аб вытоках духоўнасці ў Лунінецкім краі.

Правяла сустрэчу Іна Фралова, якая не толькі прадставіла свае новыя кнігі, але і арганізавала літаратурную віктарыну і творчую «зарадку». Сяргей Трахімёнак ва ўласцівай яму жартаўліва-сур'ёзнай манеры пазнаёміў са сваімі кінаработамі, праспяваў песні пад гітару. Завяршэннем імпрэзы стала ўскладанне кветак да помніка Мікалаю Калінковічу каля цэнтральнай бібліятэкі.

Вёсачка Цна. Цёплым дажджлівым днём, што бліжэй да завяршэння парадаваў яркім сонцам, Цна адзначыла 410-годдзе першай згадкі ў летапісах. У ліку знакамітых ураджэнцаў вёскі — Мікалай Калінковіч.

Многія цняне захапляюцца паэзіяй, некаторыя і самі займаюцца вершаскладаннем. Падарункам для аматараў літаратурнай творчасці стала выступленне Іны Фраловай. Яе малая радзіма — Вілейшчына, дзе штогод праходзіць свята «Шыпкоўскія плёсы». Госця з Мінска з цікавасцю знаёмілася з вопытам палескіх культработнікаў. У творах, што прачытала Іна Мікалаеўна, занатаваны партрэты яе землякоў. Напісаныя таленавітым аўтарам, вершы ўспрымаліся як прысвячэнне нашым бабулям і дзядам, суседзям і знаёмым…

У гэты дзень дарослым дарылі свае песні таленавітыя самадзейныя артысты, дзяцей прыцягвалі атракцыёны і салодкая вата, «карэта» для коннай прагулкі. Аднак самым кранальным момантам свята стала сустрэча выпускнікоў-1973 «васьмігодкі» праз паўстагоддзя пасля яе заканчэння. Сівавалосыя мужчыны і жанчыны дзякавалі настаўнікам і аднавяскоўцам за навуку жыцця, роднай вёсцы — за шчасце з'яўлення на свет на цнянскай зямлі.

Таццяна КАНАПАЦКАЯ
Фота аўтара

Спадчына айчыннай музыкі

Музычнае мастацтва Беларусі зарадзілася ў глыбокай старажытнасці. Яго асновай лічыцца песенны і танцавальны фальклор, які праз мастацкія вобразы адлюстроўваў жыццё і погляды людзей. Гісторыя беларускай музыкі ў пісьмовых формах і кампазітарскай творчасці мае таксама шматвяковую гісторыю. Складаная і разнастайная па змесце і формах увасаблення, характары і кірункі развіцця, яна з'яўляецца неад'емнай часткай агульнаеўрапейскай культуры. Беларускаму музычнаму мастацтву ўласціва ўнікальная этнаканфесійная адкрытасць. У ім перакрыжаваліся музычныя традыцыі хрысціянскіх, а таксама буйнейшых нехрысціянскіх канфесій. Гэтыя спецыфічныя якасці адбіліся на гісторыі і спадчыне айчыннай музыкі.

Навуковае даследаванне гісторыі айчыннай музычнай культуры пачалося ў 1960-я. Першымі працамі беларускіх вучоных сталі манаграфіі музыказнаўца Б. Смольскага і гісторыка літаратуры А. Мальдзіса. У іх работах прадстаўлена шырокая панарама музычна-тэатральнага жыцця і творчай дзейнасці кампазітараў Беларусі XVIII—XIX стст. — С. Манюшкі, М. Ельскага, М. Агінскага і інш. У гэты ж час з'явіліся артыкулы С. Нісневіч і Л. Мухарынскай, прысвечаныя музычнаму мастацтву. Кніга Л. Касцюкавец «Кантовая культура в Белоруссии», выдадзеная ў 1975 годзе, адкрыла новую старонку ў вывучэнні гісторыі беларускай музычнай культуры. У ёй аўтар даследуе адзін з найважнейшых этапаў музычнай творчасці — эпоху барока. У 1980-я з'явіліся работы музыкантаў-гісторыкаў В. Масленікавай, А. Капілава і А. Ахвердавай, у якіх асвятляюцца тэмы музычнага выхавання, гісторыя скрыпічнага і фартэпіяннага выканальніцтва. У 1990-я гады найбольш значнымі працамі, прысвечанымі прыватнаўласніцкаму тэатру Беларусі XVIII ст., а таксама музыцы ў школьным тэатры, сталі фундаментальныя працы Г. Барышава. У работах Э. Алейнікавай і Г. Таўлай раскрываецца спецыфіка беларускай народнай музычна-тэатральнай і гіравой традыцыі. Даследаванні А. Капілава, заснаваныя на матэрыялах рэдкіх выданняў і рукапісаў, прысвечаны тэатральна-музычнаму мастацтву беларускіх гарадоў і сядзіб XIX ст., дзейнасці оперна-балетных труп, шматлікіх гастралёраў, а таксама айчынных выканаўцаў і кампазітараў. У 1990 — пачатку 2000-х выйшла шмат манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, нотных зборнікаў доктара мастацтвазнаўства, прафесара В. Дадзіёмавай. У апошнія дзесяцігоддзі многія даследчыкі музыкі звяртаюцца да тэм, што доўгі час заставаліся паза межамі акадэмічнай навукі. Сярод іх — Т. Ліхач і У. Неўдах, работы якіх прысвечаны музычнай культуры розных канфесій. Канец XX — пачатак XXI ст. адзначаны актывізацыяй даследаванняў і метадычных распрацовак па гісторыі беларускага музычнага мастацтва. Імі займаліся В. Пракапцова, Р. Аладава, В. Скорабагатаў і інш. Рознабаковая інфармацыя пра музычную культуру змешчана таксама ў энцыклапедычных выданнях. У гісторыі беларускай музыкі застаецца яшчэ шмат пытанняў. Працягваецца пошук у айчынных і замежных архівах, далейшае асэнсаванне гісторыі музычнай культуры Беларусі ў розных формах і праявах: ад творчасці канкрэтных кампазітараў, станаўлення жанраў да абагульняючых распрацовак, якія раскрываюць сутнасць і асноўныя заканамернасці айчыннага музычна-гістарычнага працэсу.

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (2023, № 4), што выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, апублікаваны дадатак «Музычная спадчына Беларусі» (складальнік Г. В. Брага). У ім змешчаны звесткі пра дакументы, у якіх разглядаюцца асноўныя перыяды развіцця музычнага мастацтва Беларусі ад зараджэння да XXI ст. Дадатак складаецца з наступных раздзелаў: «Гісторыя музыкі ў працах беларускіх вучоных», «Вытокі беларускай музычнай культуры», «Музыка на тэрыторыі Беларусі ў эпоху Сярэдневякоўя», «Эпоха Рэнесансу — залаты век беларускага музычнага мастацтва», «Беларуская музычная культура ў эпоху барока і класіцызму», «Беларуская музыка XIX—XX стагоддзяў». Усе раздзелы і падраздзелы суправаджаюцца невялікімі нарысамі.

Навуковае даследаванне гісторыі айчыннай музычнай культуры пачалося ў 1960-я. Першымі працамі беларускіх вучоных сталі манаграфіі музыказнаўца Б. Смольскага і гісторыка літаратуры А. Мальдзіса. У іх работах прадстаўлена шырокая панарама музычна-тэатральнага жыцця і творчай дзейнасці кампазітараў Беларусі XVIII—XIX стст. — С. Манюшкі, М. Ельскага, М. Агінскага і інш. У гэты ж час з'явіліся артыкулы С. Нісневіч і Л. Мухарынскай, прысвечаныя музычнаму мастацтву. Кніга Л. Касцюкавец «Кантовая культура в Белоруссии», выдадзеная ў 1975 годзе, адкрыла новую старонку ў вывучэнні гісторыі беларускай музычнай культуры.

Дадатак прызначаны выкладчыкам, студэнтам, навучэнцам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў мастацтва, а таксама ўсім, хто цікавіцца беларускай музычнай культурай.

Кацярына ВАРАНЬКО

Памятныя скрыжаванні

Фота з архіва сям'і Канстанціна Скрабца.

Гэты чалавек мог стаць вядомым мастаком, але лёс распарадзіўся інакш. Шчымлівымі ўспамінамі пра сябра Канстанціна Скрабца падзяліўся заслужаны дзеяч мастацтваў Уладзімір Уродніч.

Радзіма

— Наша радзіма — вёска Вялікія Арлы — знаходзіцца ў Столінскім раёне. У свой час яна была невялікая, а вакол месціліся хутары — на такіх жылі і я, і Канстанцін Скрабец. У пачатку 1950-х гадоў улады вырашылі палепшыць стан жыцця людзей і правесці электрычнасць, таму «сцягнулі» гэтыя хутары, каб вёска была цэльная.

Многія з нас, нарадзіўшыся на канкрэтным кавалку зямлі, прызвычаіўшыся да пэўных абставінаў, усё жыццё носяць у памяці вобраз малой радзімы. Так, каля дома сям'і Канстанціна ў Вялікіх Арлах, які знаходзіўся на своеасаблівым скрыжаванні, стаяла велізарная таполя. Гэта быў нібы помнік. Там бавілі час вяскоўцы, з-пад яе людзі ішлі ў дарогу, да яе вярталіся. (Таполі некалькі гадоў таму пазразалі… А яны акрэслівалі прастору, давалі арыенцір, вызначалі напрамак. Усё вычысцілі, а нічым не замянілі.) Думаецца, і лёс Канстанціна Скрабца быў прывязаны да гэтага скрыжавання.

Дзяцінства

— Вясковыя дзеці заўсёды шукаюць адно аднаго па інтарэсах. Калі я быў у класе 6-м ці 7-м, мне сказалі: у нашай вёсцы ёсць адзін хлапчук, які надта прыгожа малюе, яго рыхтуюць да паступлення ў Мінскае мастацкае вучылішча. Ім аказаўся Канстанцін Скрабец. Яго бацька быў ветэранам вайны, гаспадарлівым чалавекам. Дзяцей у сям'і было трое. Канстанцін меў брата Васіля і сястру Галю. Сёння нікога з іх няма...

Сышліся з ім мы крыху пазней, усё ж з розных хутароў, ды і ён быў старэйшы за мяне — 1938 года нараджэння. Калі падраслі, сустракаліся на спартыўных мерапрыемствах каля Дома культуры. Нас аб'яднаў валейбол. Пра мастацтва адразу не гаварылі. Гэта пазней ужо браліся за эцюднікі і пісалі…

Вучоба

— У 1953 годзе Канстанціна Скрабца пасля 7 класаў накіравалі ў Мінскае мастацкае вучылішча. Калі ж і я пачаў вызначацца, куды пайсці пасля школы, хтосьці параіў — за Канстанцінам у вучылішча. Але чым мне ў гэтым магла дапамагчы мая маці, вясковая жанчына? Паступленню ў вучылішча паспрыяў бацька Канстанціна, які прывёз у Мінск! Дзядзька Яфім, у ягога тут ужо вучыўся сын, прадставіў мяне дырэктару Івану Краснеўскаму як сына партызана. Я прывёз з сабой работы, напярэдадні Канстанцін пазаймаўся са мною пару гадзін.

Канстанцін Скрабец вучыўся разам з мастакамі, якія пазней сталі знакамітымі творцамі, — Анатолем Бараноўскім, Васілём Сумаравым, Вячаславам Бараўко, Аляксандрам Пуцейкам… Яны ў адзін голас гаварылі: гэты малады чалавек пісаў лепей за ўсіх, быў сапраўды здольны. А выкладалі ў іх Канстанцін Касмачоў, Акім Шаўчэнка, Альгерд Малішэўскі…

Вучылішча Канстанцін Скрабец скончыў на «выдатна» ў 1958 годзе. Але ў дзяржаве быў тады такі парадак, мелася адмысловая пастанова ЦК, што толькі асобным персонам дазвалялі ісці вучыцца далей у ВНУ. Канстанцін хацеў трапіць на «Жывапіс», але ў яго не прынялі дакументы. Адправіўся працаваць па размеркаванні ў Драгічынскі раён — выкладчыкам малявання і чарчэння ў школе. А з Драгічына прызвалі ў шэрагі Савецкай Арміі. Тры гады служыў у Калінінградзе, у танкавых войсках. Пасля ён усё ж паступіў у мастацка-тэатральны — яго настаўнікамі былі Іван Ахрэмчык і Хаім Ліўшыц. Мы нават жылі ў інтэрнаце ў суседніх пакоях, разам займаліся валейболам, але ўжо мяне забралі ў армію.

Асабістае

— Ён быў настолькі сціплы, што, калі я зваў яго на танцы ў Лядзец — у гэтай вёсцы было больш дзяўчат і, як нам здавалася, яны былі прыгажэйшыя, — адказваў: «Я з табой не пайду. Ты мяне туды завядзеш, а назад я крочу адзін». Канстанцін са сваёй замкнёнасцю не мог ні з кім пазнаёміцца. Праўда, помню, у студэнцкія гады ў інтэрнаце нашы пакоі былі побач, і на Новы год пасля чаркі ён крыху пасмяляў у адносінах да адной дзяўчыны. Але на гэтым усё. Для яго, акрамя жывапісу, нічога не існавала. Хоць ён займаўся, напрыклад, гаспадарчымі справамі, але быў настолькі ціхі, спакойны, што ўсе здзіўляліся — на каго з сям'і ён падобны? Цяжка сказаць. Дарэчы, вяскоўцы далі хлопцу прозвішча «Нішчымны» (па мянушцы бацькі), заўважалі: паглядзіце, як сябе паводзіць Косцік Нішчымны? Між тым з жанчынай сваё жыццё так і не звязаў.

Лёс

— У той час, калі я вярнуўся пасля службы, Канстанцін захварэў — шызафрэнія. Яго забралі ў псіхіятрычную бальніцу. Каля месяца ён прабыў там, і пасля яму дазволілі вярнуцца на вучобу. Але хвароба надоўга не адпускала: фактычна ён дайшоў да 5 курса ВНУ і павінен быў выходзіць на дыплом. Тэму доўга не маглі падабраць, урэшце спыніліся на бытавой — ён цікавіўся вясковым жыццём, быў уважлівы да людскіх лёсаў. Эскіз зацвердзілі, Канстанцін ужо нацягнуў палатно, трэба было наносіць малюнак, але… Зноў дала пра сябе ведаць хвароба. Некалькі месяцаў у бальніцы, месяц дома. У выніку амаль не выходзіў на вуліцу.

Бывала, іду паўз іх хату, а бацька Канстанціна стаіць каля плота. Кажу: «Дзядзька Яфім, даруйце, што не заходжу. Вельмі балюча». А ў адказ: «Валодзя, я цябе разумею, і ты мяне зразумей. Заходзіш — баліць, а не заходзіш — мацней баліць». Фактычна ўсё жыццё ўспамінаецца гэта фраза. Ці мог я хоць нейкім чынам нешта палепшыць, калі б часцей да іх заходзіў?

Пасля таго як я скончыў інстытут і выйшла кніжка з аглядам сучаснага мастацтва, дзе была змешчана мая работа, Канстанцін пахваліў, не зайздросціў. Але я ўспамінаў, якія ён побач са мной ствараў эцюды, — я такога не мог зрабіць. Нездарма хлопцы, якія вучыліся з ім, заўважалі яго талент. Канстанцін мог бы стаць бліскучым жывапісцам.

Так сталася, што з хваробай ён не мог справіцца. Апошні раз я бачыўся з ім недзе ў 1998-м, у год, калі яго не стала. Прыходжу на могілкі, дзе пахаваны яго бацькі і мае родзічы, пагладжу яго надмагільны помнік, павітаю. Думаю: быў цудоўны чалавек, мог быць нашмат больш паспяховым, чым я, патэнцыял яго, на жаль, не паспеў раскрыцца.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Жнівеньскі жывапіс

Для многіх беларускіх мастакоў адна з невычэрпных крыніц натхнення — краявіды. І колькі ні паўтарай прыведзены тэзіс, усё роўна здзіўляе: наколькі адрознае бачанне мастакамі прыроды, якімі разнастайнымі сродкамі яны распавядаюць аб прыгажосці Беларусі, як дасціпна праз пейзажы выказваюць свае адносіны да свету.

Для Мікалая Таранды, які 15 жніўня адзначыць 76 гадоў, беларуская прырода застаецца спагадлівым суразмоўцам. На сваіх карцінах творца імкнецца захаваць яе непаўторную прыгажосць. Як гэта ў яго атрымліваецца, можна ўбачыць у Нацыянальным мастацкім музеі, дзе нядаўна адкрылася персанальная выстаўка «Колер жніўня». Аўтару ёсць чым пахваліцца: за паўстагоддзе творчай працы створана велізарная колькасць жывапісных, графічных твораў, выкананых у розных жанрах і тэхніках. Ён любіць працаваць, напрыклад, з фігуратыўным і абстрактным жывапісам, пазнавальным пейзажам і няяснай кампазіцыяй.

Мікалай Іванавіч Таранда — жывапісец і графік, член Беларускага саюза мастакоў. Нарадзіўся ў вёсцы Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Кіраваў студыяй выяўленчага мастацтва Палаца культуры завода «Чырвоны Кастрычнік» у Оршы, займаў пасаду начальніка бюро прамысловай эстэтыкі. У 1984—1985 гадах удзельнічаў у распрацоўцы і стварэнні помніка жыхарам горада Барані, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. З 1994 года цалкам у творчасці. Супрацоўнічае з творчым аб'яднаннем «Традыцыя» БСМ.

«Касіў Ясь канюшыну… Памяці У. Мулявіна», 2017 г.

Мастацтвазнаўцы неаднаразова разважалі пра ўплыў на творчасць Мікалая Таранды французскіх імпрэсіяністаў, фавістаў і постімпрэсіяністаў (асабліва Поля Сезана). Ён і сам гэтага ніколі не адмаўляў. Што адрозніваe жывапіс мастака ад твораў іншых беларускіх пейзажыстаў? Найперш экспрэсія; рух, дзеянне, няспыннасць, дынаміка — любое з гэтых вызначэнняў пасуе да яго палотнаў. Хоць месцамі назіраецца і статычнасць — там, дзе аўтару хацелася выявіць спакой, гармонію, сум.

У экспазіцыі, куратарам якой выступіла Кацярына Калянкевіч, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела беларускага мастацтва XX — пачатку XXI ст., прадстаўлены жывапісныя творы, што найбольш яскрава выказваюць творчае крэда аўтара: пейзажы, кветкавыя нацюрморты і шмат абстракцый. Між тым «Колер жніўня» расказвае зусім не пра жнівень. Хутчэй гэты месяц мае перспектыву запомніцца нам колерамі Мікалая Таранды. А ён не саромеецца быць яркім, не абмяжоўваецца цёплымі ці халоднымі фарбамі, яркімі ці цьмянымі адценнямі.

— Атмасфера выстаўкі адпавядае жнівеньскаму настрою дзякуючы яркім, сакавітым, насычаным, недзе нават люмінесцэнтным фарбам у яго палотнах, — адзначыла падчас адкрыцця Ганна Конанава, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. — Летась Мікалай Іванавіч святкаваў сваё 75-годдзе. Але гэта тая дата, якую можна адзначаць увесь год, і мы рады павіншаваць майстра на пляцоўцы музея.

Выстаўка будзе працаваць да 10 верасня.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Што нам гаворыць лебедзь са сцэны?

Гадоў пяць таму мне давялося глядзець балет «Лебядзінае возера» ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Пастаноўка праходзіла ў зале, на траціну пустой. Лябёдка была асабліва прыцягальная. Я нават рызыкнула ціхенька перабегчы на першы рад, каб лепей разгледзець, што яна сваімі вытанчанымі рухамі хоча нам давесці... Перад самай сцэнай нечакана сутыкнулася са знаёмым, які, як і я, неверагодна ўражаны ўбачаным цудам мастацкага пераўвасаблення чалавека ў птушку, не змог устрымацца на сваім месцы ў глыбіні партэра. Праз некаторы час хлопец прызнаўся: тым вечарам настолькі захапіўся балерынай, што знайшоў яе ў сацыяльнай сетцы, «пасябраваў», асмеліўся завесці размову. Пастаноўка скончылася, але далікатныя рухі таленавітай актрысы яшчэ доўга жылі ў маёй галаве, а ў іх прыемнай кампаніі нараджаліся розныя думкі. З часам, са зменамі ў грамадскім жыцці яны раслі і ўзмацняліся, а падзяліцца я адчула патрэбу толькі цяпер.

Мы жывём у свеце, у якім аўдыё-, відэа-, фотакантэнт льецца на спажыўцоў з кожнага дэвайса, і, нягледзячы на такую колькасць інфармацыі, амаль што кожны лічыць сябе абавязаным бясконца яе множыць, каб абазначыць гэтым сваю прысутнасць у свеце. Цяпер інфармацыя прызнаецца адной з асноўных прычын стрэсу ў чалавечым жыцці, пра разбуральнае ўздзеянне якога вядзецца столькі размоў. Трэба лічыцца з відавочнымі сацыяльнымі пераменамі, у прыватнасці, з набыццём вагі віртуальнай ідэнтыфікацыі асобы побач з рэальнай. Палохае ўжо не само памнажэнне інфармацыі ў свеце, дзе кожны становіцца аўтарам — творцам у тым ці іншым разуменні (як мінімум, свайго вобразу ў інтэрнэт-прасторы). Уражвае, што значная частка актуальнага, папулярнага кантэнту напоўнена тым, што паволі, але ўпэўнена разбурае чалавечую псіхіку праз спецыфічнае ўздзеянне на органы пачуццяў. Асаблівая гаворка пра зрок і слых.

СМІ, медыя і ўвогуле поп-культура ўтрымліваюць неверагодную колькасць усяго таго, што арыентавана на гіперстымуляцыю пачуццяў. Патокі крыві льюцца на нас з экрана ў штодзённа і нават штогадзінна, навіны перапоўнены інфармацыяй як пра прыватныя злыбеды, так і пра катаклізмы агульнаграмадскага ці агульнапланетарнага ўзроўню. Мы атрымоўваем патрэбную і непатрэбную нам інфармацыю пра тое, што адбываецца ў самых далёкіх кутках свету. Сама імклівая змена малюнкаў ці нават фрагментаў тэксту перанасычае псіхіку, ператвараючы нас у носьбітаў той самай кліпавай свядомасці, — і мы становімся неўспрымальнымі да звычайнага, простага, ледзь улоўнага. Для многіх — і малых, і нават дарослых — спосабам адпачынку становіцца татальнае заглыбленне ў свет відэагульняў. Бывае, перастаючы размяжоўваць іх з рэальнасцю, чалавек пачынае думаць, што заўсёды мае магчымасць атрымаць новае жыццё. Нескладана ўявіць, якія наступствы можа адчуць мозг, асабліва не вельмі здольны да якаснай рэфлексіі, — аповеды пра гэта з зайздроснай рэгулярнасцю выдаюць навіны.

Сюжэт, калі творца, ахоплены пошукам дасканалых сродкаў выяўлення, перастае размяжоўваць сапраўднасць і мастацтва і ў рэшце рэшт памірае, не новы і часта сустракаецца, напрыклад, у літаратуры мадэрнізму — у канцы XIX — пачатку XX ст. У гэтым выпадку смерць можна разглядаць як ахвяру на алтар вынаходніцтва — такое мастацкае «апраўданне» сцірання межаў паміж выдуманым і рэальным час ад часу фігуруе ў аўтараў згаданага літаратурнага кірунку. Атрыманае ад відэагульні аналагічнае ўздзеянне на няўстойлівую чалавечую свядомасць, аднак, не пазначана высокімі мэтамі і правакуе разбуральныя страты, пераважна бессэнсоўныя, ні на што добрае не скіраваныя.

Цудоўны фільм Джэймса Кэмерана «Аватар. Шлях вады» — вынік шматгадовай дэталёва прадуманай рэжысёрскай работы — захапляе выдуманым светам незвычайных істот, духоўна і фізічна прыгожых, якія жывуць на ўлонні прыроды, у першабытнай гармоніі з ёй. Але па меры разгортвання падзей становіцца зразумела: і гэтая стужка напалову складаецца з выяўлення бойкі і спадарожных ёй уражальных спецэфектаў, што даволі паказальна само па сабе. Стваральнікі, добра арыентуючыся ў тым, што можа прынесці прыбытак, усведамляюць, што сучасніка ўсё больш складана нечым уразіць, таму ўсе сілы стараюцца ўкладваць у маштабнасць ды відовішчнасць свайго «прадукту».

Сцэна з балета «Лебядзінае возера».

Мова лебядзіных рухаў — вельмі ціхая мова. Фрагменты тэксту, малюнкі сыплюцца на нас з кожнага акаўнта — тэатр нясмела падказвае, што можна увайсці. Спецэфекты крычаць — лябёдка незаўважна шэпча. Без дазволу кроў і іскры ўрываюцца ў наш свет — танец балерыны сціпла запрашае прыгледзецца. Трылер прымушае нашыя зрэнкі пашырацца — лябёдка не дае сябе разгадаць без удумлівай узаеманастроенай сутворчай работы…

Даследчыкі чалавечага мозгу пераконваюць нас: усё, што ў яго трапляе, застаецца там назаўсёды (на паверхні, у свядомасці, ці ў глыбінях, у падсвядомым), а таму вызначае наша светаадчуванне, наш светапогляд, нашыя ўчынкі. Падчас бесперапыннай плыні моцных уражанняў псіхіка падвяргаецца каласальнай атацы, якая незаўважна вынішчае чалавечую здольнасць нармальна, паўнавартасна адчуваць як жыццё, так і свет мастацтва.

Чамусьці мы крыўдзімся на дактароў за іх неадчувальнасць да чужога болю, чужых пакутаў, але многія з іх вымушана прыглушылі ў сабе пачуцці дзеля таго, каб быць у стане добра выконваць сваю справу. І тады гэта душэўнае амярцвенне па-свойму апраўдана. Звычайны ж чалавек без мэты, бяздумна і добраахвотна вынішчае свае пачуцці — проста без разбору «спажываючы» ўсё на свеце.

Калі ў кінатэатры глядзіш вострасюжэтны трылер ці стужку са спецэфектамі, у якіх на цябе з экрана плывуць хвалі іскраў і паралельна з гэтым чутны гукі выбухаў і перастрэлак, органы пачуццяў знаходзяцца ў стане гіперстымуляцыі. З часам каналы ўспрымання элементарна «забруджваюцца» і не дазваляюць нармальна адчуваць простыя рэчы: чалавек болей не рэагуе на звычайную ступень эмацыйна-разумовага ўздзеяння. І ўсё большае ўзбуджэнне яму патрэбна дзеля таго, каб быць у стане нешта яшчэ адчуваць, і ўсё больш уражальныя спецэфекты неабходныя, каб па-ранейшаму рэагаваць.

Эфект гіперстымуляцыі праяўляе сябе ў многіх сферах чалавечага жыцця. Нельга нармальна ўспрымаць смак ежы, калі штодзённа празмерна ўжываць соль, цукар, прыправы, што да таго ж непазбежна вядзе да патрэбы ў павелічэнні «дозы». Людзі, кінуўшы паліць, нечакана адкрываюць для сябе спектр новых адчуванняў, здзіўляючыся, што і ў вады таксама ёсць смак. Забіваюць рэцэптары алкаголь, кава, нават секс… Гэты пералік можа быць доўгім.

Нядзіўна, што мы не разумеем ні оперы, ні балета — для нас гэта занадта складаныя жанры. Яны сапраўды патрабуюць ад рэцыпіента саўдзелу, а часам і напружанай работы. Да іх прагляду трэба рыхтавацца: азнаёміцца з інфармацыяй пра аўтара лібрэта і музыкі, супакоіцца і ўвогуле настроіцца эмацыйна, каб быць у стане нармальна адчуваць тое, што табе хочуць паведаміць спевакі ці танцоры з вялікай сцэны. Сёння чалавек жыве ў такіх абставінах (і не ўлічваць ці не прымаць гэта ўжо, на жаль, немагчыма), што яму неабходна свядома рыхтаваць сваю нервовую сістэму да наведвання тэатра.

Сюжэт, калі творца, ахоплены пошукам дасканалых сродкаў выяўлення, перастае размяжоўваць сапраўднасць і мастацтва і ў рэшце рэшт памірае, не новы і часта сустракаецца, напрыклад, у літаратуры мадэрнізму — у канцы XIX — пачатку XX ст. У гэтым выпадку смерць можна разглядаць як ахвяру на алтар вынаходніцтва — такое мастацкае «апраўданне» сцірання межаў паміж выдуманым і рэальным час ад часу фігуруе ў аўтараў згаданага літаратурнага кірунку.

Калі тыднямі і месяцамі існуеш, уваткнуўшы розум у смартфон, паглынаючы кароткія блокі інфармацыі, становіцца фізічна і псіхічна складаным ці ўвогуле немагчымым засяроджанне на вялікім тэксце на працягу некалькіх гадзін. Сумна і доўга (і, канешне, незразумела, навошта?!) чытаць кнігу, трацячы гадзіны і дні, калі можна «ўліць» у сябе яе за пару хвілін у фармаце кароткага зместу ці, яшчэ лепей, відэароліка са сціслым пераказам.

Але добрыя рэчы нараджаюцца і выношваюцца доўга — такое жыццё. Свет мастацтва — тонкая сфера, таму што абмен інфармацыяй паміж, з аднаго боку, аўтарам / стваральнікам / выканаўцам і, з другога, — рэцыпіентам / чытачом / слухачом / гледачом адбываецца на ўзроўні вобразаў — даступнай чалавеку творчай формы асваення і інтэрпрэтацыі свету. Калі калега выкладала ў харэаграфічным каледжы, на заданне напісаць сачыненне яна атрымоўвала сустрэчныя прапановы ад студэнтаў: можна мы вам «станцуем» гэту тэму?

Значыць, і танцам можна гаварыць, таксама як і музыкай, пэндзлем і карцінай, у якія аўтар укладвае частку сябе і свайго досведу? Пытанне, як разумець гэтыя тонкія рэчы ў свеце, дзе ні на хвіліну не спыняецца паляванне на тваю ўвагу, а выйсці з «гульні» чым далей, тым менш уяўляецца рэальным. Адказ — хіба што свядомая работа па захаванні псіхікі ў стане здольнасці рэагаваць на добрае і прыгожае ў яго чыстым, першапачатковым выглядзе.

Шляхі даўно вядомыя і прымяняльныя да сучасных рэалій: ва ўсіх рэлігіях ёсць аскеза, вытрымаўшы якую, чалавек (апроч узвышаных духоўных мэтаў, якія, канешне, пераважаюць у вернікаў) надзяляецца магчымасцю адчуць жыццё і звыклыя рэчы больш поўна і ярка. Недарэмна людзі, здольныя разумець інфармацыйную агрэсію на сваю асобу, наладжваюць сабе адмысловыя інфа-, СМІ-, медыяпоставыя абмежаванні. Каб хоць трошкі прывесці ўспрыманне ў стан, неабходны для здаровага рэагавання, у тым ліку на прыгожае.

І мне адначасова будзе цікава і страшна, калі давядзецца патрапіць зноў на той самы балет у той самы тэатр, апынуцца перад той самай лябёдкай. Я не ведаю, ці здольная мая псіхіка праз пяць гадоў пасля першага прагляду, праведзеных ва ўздзеянні інфамедыясвету (ён усё болей разганяецца — так, што не спыніць, не стрымаць), адчуць, што гаворыць цудоўны лебедзь са сцэны.

Наталля БАХАНОВІЧ
Фота Кастуся ДРОБАВА

Даследчыкі чалавечага мозгу пераконваюць нас: усё, што ў яго трапляе, застаецца там назаўсёды (на паверхні, у свядомасці, ці ў глыбінях, у падсвядомым), а таму вызначае наша светаадчуванне, наш светапогляд, нашыя ўчынкі. Падчас бесперапыннай плыні моцных уражанняў псіхіка падвяргаецца каласальнай атацы, якая незаўважна вынішчае чалавечую здольнасць нармальна, паўнавартасна адчуваць як жыццё, так і свет мастацтва.

Чалавекалюбства, на якім трымаецца свет

Тэма «Беларускае кіно і творчасць Васіля Быкава», здаецца, невычарпальная. Кожны, хто прычыніўся да роздумаў над ёй, выкладае і адстойвае свой пункт гледжання. Гэта каштоўна. Але яшчэ болей цэнна сачыць за няспынным аналізам сувязі кіно і літаратуры — экранізацыямі па творах Быкава. Увазе чытача «ЛіМа» — працяг разважанняў Антаніны Карпілавай, загадчыцы аддзела экранных мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Другая хваля: глыбінная шматслойнасць

— Другі ўсплёск цікавасці да прозы Быкава ў беларускіх кінематаграфістаў адбыўся ў другой палове 1980-х. Гэтую старонку адкрывае «Знак бяды» Міхаіла Пташука. Жанр фільма вызначыць цяжка: тут трагедыя, нехта лічыць, што гэта меладрама, а ў нечым можна яго назваць прыпавесцю. Шматслаёвы фільм, які, на мой погляд, не змог адлюстраваць усю глыбіню прозы. Бо ў аповесці шматслойнае апавяданне, звязанае з быццём, а не проста з падзеямі жыцця Сцепаніды і Пятра, якія перасяліліся на хутар. А чаму на хутар? Бо іх у свой час раскулачылі. Мінімальная колькасць персанажаў, ёсць два галоўныя героі — сямейная пара. Калі Сцепаніда ўспамінае сваё даваеннае мінулае, яно ўспрымаецца як трагедыя сяла і яе сям'і 1930-х гадоў. Гэтая трагедыя перагукаецца з яе сучаснасцю: энергія супраціву працягваецца менавіта ў гэтай жанчыне. Сцепаніда супраціўляецца любой форме гвалту, у тым ліку і нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адзін з першых актаў яе супраціву — калі яна доіць карову і вылівае малако на зямлю, каб не дасталося акупантам. Кульмінацыя — калі яна знаходзіць бомбу і хоча падарваць мост. Актрыса Ніна Русланава экспрэсіўна іграе гэтую сцэну, якая пераварочвае душы і сэрцы: яна коціць бомбу, прыгаворваючы, што збіраецца з ёй зрабіць. Але не атрымалася, таму што ўзнікае трэцяя сіла — гэта вельмі важна для Быкава, які разглядае грамадства ва ўсёй яго складанасці. Тут не проста «нашы» і «чужыя». Тут узнікаюць яшчэ паліцаі. І таксама невыпадкова. Яны выраслі з дзяцей рэпрэсаваных, пакрыўджаных на савецкую ўладу. Менавіта яны Сцепаніду прыгаворваюць, па сутнасці, да смерці. Зачыніўшыся ў сваёй хаце, яна здзяйсняе самаспаленне, каб не падвяргацца гвалту, ужо вычарпаўшы свае сілы. Гэта лінія на ўзроўні антычных трагедый — «Медэі» або «Электры». Але да фільма было вельмі неадназначнае стаўленне — не толькі з-за экранізацыі, але і з-за літаратурнай асновы.

Я б сказала, што гэта самая неадназначная стужка беларускай экраніяны паводле Быкава. Нацыянальны характар тут у поўнай меры перадае Пётр, увасоблены Генадзем Гарбукам. Ён цярплівы, але ўзнімае свой голас і супраціўляецца, калі ўласная жонка разбівае яго скрыпачку. Скрыпка — сімвал прыгажосці і гармоніі быцця. І калі Пётр узнімае голас, то гэта значыць, што ён ужо дайшоў да краю. Яны абодва гінуць. Але вогнішча самаспалення выклікае шмат пытанняў, таму што беларусы ўсё ж хрысціяне гістарычна і па сутнасці сваёй, самагубствы ў прынцыпе былі недапушчальныя. Вядома, гэтая сюжэтная лінія ў аповесці больш матываваная. Але Міхаіл Пташук — таксама асаблівы свет, ён унікальны рэжысёр у беларускім кінаасяроддзі. Гэта абсалютная эмацыйнасць, экспрэсія, перадоленне ўсякіх штампаў дзеля таго, каб прабіцца да свядомасці масавага гледача. Што часам абарочвалася, магчыма, нават перабольшанай эмацыйнасцю. Але яна выклікала жывы водгук. А тут рэжысёр стараўся падкрэсліць трагедыю беларускага народа, які ў агні вайны страціў шмат сваіх людзей.

У 1989 годзе выйшаў фільм «Круглянскі мост», які лічыцца вельмі ўдалай экранізацыяй Быкава. Карціна вяртае да праблемы выбару, якая тут гучыць яшчэ больш востра, чым у папярэдніх фільмах, што больш адпавядае быкаўскаму разуменню і адчуванню экзістэнцыйных сітуацый. Таму што тут ідзе гаворка не проста пра смерць — пра смерць дзіцяці. Тэма вострая, звязаная не столькі з вобразамі ворагаў-фашыстаў, якія прынеслі вайну на чужую зямлю, колькі з тэмай партызан і паліцаяў (гэта «трэці пласт» людзей, якія ўдзельнічалі ў вайне). Рэжысёр засяродзіўся якраз на больш камернай унутранай драме, звязанай з супрацьстаяннем у межах аднаго народа. Гэта падабенства грамадзянскай вайны, дзе ёсць падзел не проста на сваіх і чужых, таму што з'яўляюцца свае, якія становяцца чужымі. Партызаны павінны ўзарваць мост, яны вырашаюць выкарыстаць для гэтага сына паліцая. І калі адзін партызан разумее, што дзіця не можа адказваць за выбар бацькі, то іншы вырашае ўзарваць мост, нягледзячы ні на што. Расійскі рэжысёр Аляксандр Мароз прасякнуўся дылемай, якая хвалявала Быкава, і паставіў гэтае пытанне вельмі жорстка — на ўзроўні лёсу дзіцяці. Вядома, тут ёсць некаторыя перабольшанні. Упершыню ўведзены малітвы, іконы, і нават рыхтуючыся да аперацыі, партызан кажа: «Госпадзі, памілуй...». Гэта нечакана і незвычайна для Быкава, але для таго часу, калі карціна выходзіла на экраны, было вельмі актуальна, таму што ў грамадства вярталася традыцыя веры.

У Быкава асабліва стаўленне і да жаночых вобразаў. Асобна стаіць фільм «Фруза». Насамрэч Быкаў шматмерны: не толькі экзістэнцыйны выбар — яго заўжды цікавілі пытанні і самога існавання чалавека. Што ёсць чалавек? Навошта ён прыходзіць у свет? Што ёсць жанчына, якая дае жыццё? У гэтай парадыгме вылучаецца фільм «Фруза». Я вельмі яго люблю, гатова пераглядаць шмат разоў. Рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў зняў тэлевізійны фільм,

Кадр з фільма «Знак бяды».

але вельмі незвычайны ў кантэксце творчасці пісьменніка: тут гучыць тэма жанчыны і мацярынства. Яна ідзе, вядома, ад яго ўспамінаў аб маці, якая была вельмі мяккім, нават жаласлівым чалавекам. Відавочна, дзякуючы маці ў ім былі закладзены і праявіліся спачуванне і эмпатыя. Яны ёсць і ў некаторых жаночых вобразах Быкава: такая Джулія ў «Альпійскай баладзе», Сцепаніда ў «Знаку бяды», хоць яна крыху іншая, але самы цёплы і сардэчны жаночы вобраз мы бачым у тэлефільме «Фруза». Выдатная карціна з камернымі цёплымі інтанацыямі. Актрыса Таццяна Куліш цудоўна сыграла галоўную гераіню, якая працуе ў нейкай установе. А ёй нібыта апаніруе прыбіральшчыца, якая 10 дзяцей выгадавала, — строгая жанчына, максімаліст у сваіх выказваннях, яе іграе Галіна Макарава. Мы бачым пасляваеннае жыццё, і быццам няма ніякай вострай праблемы, як звычайна ў Быкава, каб паставіць героя ў жорсткую сітуацыю выбару. А ўсё ж такі выбар ёсць: быць гераіні з жанатым шафёрам ці не?.. Бо ўсе, хто яе клікаў замуж, загінулі на франтах. Пасляваенная рэальнасць адлюстравана вельмі тонка: сяло, куды прыязджае Фруза да дзядулі разам з дзіцем, — даволі суровае, але сардэчнасць у людзях засталася. Нечаканы раман гераіні заканчваецца нараджэннем дзіцяці — гэта выдатны фінал, нягледзячы на тое, што хутчэй тут пастаўлена шматкроп'е: складаны быў пасляваенны лёс у жанчыны з дзіцем і без мужа. Ніхто мараль не адмяняў, а жыць усё роўна трэба было, і дзяцей хацелася. Ідэя працягу жыцця — для мяне гэта нечаканая мадуляцыя ў творчасці Быкава. Але яна ўзнікла невыпадкова, калі разумець, як ён ставіўся да маці.

Да другой хвалі адносіцца фільм «Пайсці і не вярнуцца». Я лічу, што гэта інтэрпрэтацыя «Альпійскай балады», але ў іншым кантэксце. Тут таксама два чалавекі, у цэнтры — іх каханне. Антон і Зося (яе іграе знакамітая Юлія Высоцкая) сыходзяць з партызанскага атрада на разведку. Антон ратуе дзяўчыну, якая ўпала ў ледзяную ваду, яны ідуць сагрэцца ў разбураны дом. Любоўная сцэна вельмі арганічна паказана рэжысёрам Мікалаем Князевым. Але далей пачынаюцца быкаўскія метамарфозы: выпрабаванне на маральнасць, таму што героі выпадкова чуюць, як міма праходзяць паліцаі і гавораць, што Сталінград узяты. Антон, які да гэтага вагаўся, вырашае пайсці з атрада, а гэта значыць — стаць здраднікам. І пачынаецца дылема чалавека, які апынуўся на ростанях. Князеў паспрабаваў нават сысці ў любоўную гісторыю, але ад Быкава нікуды не ўцячэш... Зося не гатова здрадзіць, хлопец яе шантажуе. Да гэтага часу памятаю вельмі яркі фінал: на заснежаным полі яны разыходзяцца, і ён страляе ёй у спіну. Яна падае, але падымае галаву і бачыць здалёк, як ён сыходзіць... А калі ён вяртаецца, яе ўжо няма. Тут мы адыходзім у прыпавесць, у нейкую метафарычную плоскасць, што ўласцівая прозе Быкава. Не ўсім рэжысёрам удаецца гэта. Фільм заканчваецца знакам пытання: дзе яна? Як быццам узнеслася да неба. Але справа нават не ў гэтым, а ў тым, што чалавек застаецца сам-насам са сваім сумленнем. Фільм неадназначны, у перабудовачныя гады ён паставіў складаныя пытанні: куды ісці? На якія ідэі абапірацца чалавеку? На аснове чаго будаваць жыццё далей?

Вядома, у 90-я гады XX стагоддзя адной з кульмінацый другой хвалі стала карціна вельмі неадназначная ў плане экранізацыі прозы Быкава. Кажуць, што ён прызнаваў «Узыходжанне» Ларысы Шэпіцькі. І цяпер, пераглядаючы гэтую карціну, сапраўды бачыш нейкую міфалагічную, нават біблейскую жорсткасць у вызначэнні персанажаў. Наш час, магчыма, мае патрэбу ў разважаннях. Але для таго часу — а гэта канец 1970-х — фільм Ларысы Шэпіцькі быў эталонам стылю. Дык вось, у фільме «На чорных лядах» 1995 года рэжысёр Валерый Панамароў таксама імкнуўся паставіць пытанні жорстка і стварыў нейкі абагульнены вобраз гісторыі. У аснову карціны леглі два апавяданні, якія Васіль Уладзіміравіч напісаў у 1990-я гады. Было адчуванне, што тут дамінуе плакатная стылістыка — чорнабелая. Гэта, безумоўна, спроба стварэння прыпавесці на аснове гістарычнага матэрыялу. Восем чалавек пасля няўдалага паўстання вырашаюць скончыць жыццё самагубствам. Гэта ўжо выклікае вялікае пытанне, бо беларусы, як мы адзначалі, былі выхаваны на трывалых хрысціянскіх традыцыях. Што прымірае з гэтым фільмам і з апавяданнямі Быкава? Тое, што камандзір блаславляе на жыццё самага малодшага з удзельнікаў групы, практычна падлетка. Юны хлопец, які не акрэп духоўна, хавае паплечнікаў і са слязамі вяртаецца да сваіх. На мой погляд, гэта вельмі жорстка, але не пераканаўча, таму што сітуацыя даведзена да тупіка.

Трэцяя хваля: сімвалічная шматзначнасць

— Безумоўна, трэба сказаць пра фільм «У тумане» — гэта трэцяя хваля цікавасці да прозы Быкава ў кіно, ужо ў XXI стагоддзі. Цікавасць застаецца, нягледзячы на тое што рэжысёры цяпер баяцца экранізацый такога складанага матэрыялу. Але фільм «У тумане» быў адзначаны на многіх прэстыжных кінафестывалях. У галоўнай ролі абходчыка Сушчэні здымаўся малады акцёр Уладзімір Свірскі, які дзякуючы гэтай працы атрымаў наймагутнейшы штуршок для прафесійнай дзейнасці. Тут ён вельмі тонка паказаў свайго героя, які аказваецца ў немагчымай сітуацыі — тут ёсць працяг асноўнай быкаўскай ідэі. Партызаны аб'яўляюць Сушчэню здраднікам, з-за якога, лічыцца, загінулі іншыя людзі. Фашысты яго адпусцілі, але партызаны прыходзяць да яго ў дом і гатовыя здзейсніць смяротны прысуд. Мы назіраем за блуканнямі трох чалавек у лесе, у тумане. У выніку Сушчэня цягне аднаго партызана на сваім гарбе і прыходзіць да фіналу — а ён шматзначны...

Калі знясілены Сушчэня з позіркам зацкаванага чалавека сядзіць паміж двух партызан, то ён нагадвае Хрыста на Галгофе. На мой погляд, гэта карціна вельмі хрысціянская па сутнасці. Яшчэ і гук стварае пэўны фон. Мне вельмі падабаецца, што фільм ідзе без музыкі. Шумавая партытура проста раскошная: адна яе частка антрапагенная (чалавечая гаворка, дыханне, уздыхі, усхліпы), а яшчэ адна частка — прыродныя гукі. Тэхнагеннасць і цывілізацыя (цягнік, зброя) змяняюцца прыродным асяроддзем, куды героі паступова сыходзяць. Потым знікае і чалавечая прырода ў гуках, і застаецца толькі рып асіны. Асацыяцыі вельмі магутныя. І фільм сур'ёзны, патрабуе суперажыванняў і разважанняў. Што яшчэ раз звяртае нас да больш глыбокага прачытання творчасці Быкава: ён заўсёды актуальны, і не толькі таму, што людзі не змаглі выкараніць вайну як з'яву. Яшчэ і таму, што ён бачыў, цудоўна разумеў сутнасць розных людзей у крайнія моманты жыцця і паказваў вобраз чалавекалюбства, на якім трымаецца наш свет. Таму я лічу, што трэцяя хваля цікавасці да Быкава ў кіно апелюе да фільма «Узыходжанне» Ларысы Шэпіцькі.

Ці будзе чарговая хваля? Магу сказаць, што ў моладзі ёсць цікавасць. У 2017 годзе з'явілася кароткаметражная іграваяя стужка «Бацька», знятая маладым рэжысёрам Ігарам Васільевым, якая працягнула традыцыі найлепшых фільмаў паводле прозы Быкава. У ёй паказана беларускае сяло, куды прыходзяць фашысты. Бацька бярэ на сябе грэх гібелі людзей замест сына — такім чынам ён ратуе сваіх дзяцей ад ганьбы. Падаецца, што ў гэтай карціне нібыта нічога новага няма, але гэта цікавасць да тых падзей, памяць аб якіх жыве ў Беларусі, у тым ліку дзякуючы літаратуры.

Гутарыла Ларыса ЦІМОШЫК

Заканчэнне. Пачатак у № 31.

На мове арыгінала — шэдэўры

Засталося не так шмат лета — хутка пачнецца чарговы тэатральны сезон, адкрыюцца новыя выстаўкі, адбудуцца традыцыйныя фестывалі. А пакуль ахвотных радуюць праекты з шэдэўрамі кіно, ініцыяваныя ў Мінску. Так, працягваецца «Жывая музыка кіно» Заслужанага калектыву Беларусі Дзяржаўнага камернага аркестра — у кінатэатры «Цэнтральны» ў суправаджэнні ансамбля салістаў пройдуць паказы нямых кінакамедый Бастэра Кітана «Каледж» (16 жніўня) і «Шэрлак Малодшы» (30 жніўня). Музыку для кінастужак напісаў даўні сябар аркестра — амерыканскі піяніст, дырыжор і кампазітар Стывен Прутсман. Тым часам *#Cinemascopeshhh 2023*, а гэта кінапаказы ў дворыку Музея-майстэрні Заіра Азгура, прапануўвае бясшумнае кіно пад адкрытым небам. Дапамагаюць у такой справе бесправадныя навушнікі.

Сёлетні *#Cinemascopeshhh* пачаўся 25 ліпеня з камедыі «Вакацыі спадара Юло» (1953) Жака Таці (сапраўднае імя Якаў Георгіевіч Таціішчаў), французскага сцэнарыста, акцёра і рэжысёра. Пазней гледачы паглядзелі мюзікл «Тыя, хто спявае пад дажджом» (1952, США) Стэнлі Донена і Джына Келі. 1 жніўня адбыўся паказ французскай меладрамы «Сябар маёй сяброўкі» (1987) Эрыка Ромера, а 4 жніўня — драмы «Унутры Льюіна Дэвіса» (2012) знакамітых амерыканцаў Ітана і Джоэла Коэнаў. На гэтым тыдні паспелі паказаць «Кэры» (1976), амерыканскі фільм жахаў Браяна дэ Пальмы.

Што цікавага чакае гледачоў? Сёння — «У джазе толькі дзяўчаты». Фільм 1959 года застаецца папулярны дагэтуль. Меладрама, камедыя, крымінал — стужка амерыканца Білі Уайлдэра вельмі палюбілася гледачам па ўсім свеце. Здавалася б, няхітры сюжэт: чыкагскія музыкі Джо і Джэры выпадкова становяцца сведкамі бандыцкай перастрэлкі і ў тэрміновым парадку бягуць на цягніку ў Фларыду, прыкінуўшыся жанчынамі. Цяпер яны — Джозэфіна і Дафна, новенькія інструменталісткі жаночага джаз-бэнда. Да часу іх маскіроўка спрацоўвае. Але неўзабаве з'яўляецца поўная любасці салістка… Яе сыграла знакамітая прыгажуня Мэрылін Манро. У тым ліку дзякуючы ёй фільм здабыў такую папулярнасць.

15 жніўня для аматараў кіно падрыхтавалі прагляд фільма «На апошнім дыханні» (1963). Рэжысёр — Жан-Люк Гадар, французскі геній, якога не стала летась, 13 верасня. Кінарэжысёр, кінакрытык, акцёр, сцэнарыст, мантажор і кінапрадзюсар, ён стаяў каля вытокаў французскай новай хвалі ў кінематографе, паўплываў на рэвалюцыю ў сусветным кінамастацтве. Драма «На апошнім дыханні» распавядае пра маладога і саманадзейнага Мішэля Пуакара, які зарабляе на жыццё крадзяжамі дарагіх машын. Пра наступствы ён не

разважае. Але аднойчы, па дарозе ў Парыж, герой забівае паліцэйскага без асаблівай прычыны. Сёння для многіх сюжэт стужкі, героі, кампазіцыя і асабліва рух камеры робяць яе дзівакаватай, нескладнай, цяжкай для ўспрымання. Прыкладна такой яна падавалася масаваму гледачу і ў перыяд прэм'еры. Але падыходы, блізкія Гадару, новаўвядзенні, якія аўтар прыўнёс і ў гэты фільм, паўплывалі на самое развіццё мастацтва.

22 жніўня адбудзецца паказ амерыканскага фантастычнага фільма «Чужы» (1979) Рыдлі Скота. Для многіх гледачоў фільм застаецца невядомы з-за тэматыкі і жахаў на экране. Зноў жа — далёкая будучыня, касмічны карабель, нязнаныя планеты, разгубленыя астранаўты, прадметы, якія па выглядзе нагадваюць гіганцкія коканы, — зачын адпужвае вялікую колькасць гледачоў, але, як падказваюць кінакрытыкі на працягу дзесяцігоддзяў, тыя баяцца дарэмна.

29 жніўня арганізатары прапануюць трылер «Ззянне» Стэнлі Кубрыка. Амерыканскі фільм 1980 года зняты па матывах аднайменнага рамана Стывена Кінга, які рэзка негатыўна выказваецца аб гэтай версіі «Ззяння», бо рэжысёр не проста перарабіў увесь сэнс рамана, але яшчэ і адпрэчыў сцэнар самога аўтара (той напісаў адаптацыю ў суаўтарстве з іншым пісьменнікам — Даян Джонсан). Стэнлі Кубрык амаль цалкам выключыў з апавядання ўсю містыку — яго цікавіла не ўварванне зданяў у рэалістычны побыт амерыканцаў з сярэдняга класа, а вар'яцтва, у якое герой павольна апускаецца, апынуўшыся ў пустаце і цішыні гатэля. Захапляе?

Дарэчы, усе фільмы праекта *#Cinemascopeshhh 2023* дэманструюцца на мове арыгінала з рускімі субтытрамі. Паказы праходзяць пад адкрытым небам, таму рэкамендуецца браць з сабой цёплае адзенне ці пледы. Вядома, што ў выпадку неспрыяльнага надвор'я сеансы пераносяцца ў Скульптурную залу музея.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фільмы, на якіх мы выраслі

Беларускі кінематограф вядомы ўсяму свету стужкамі пра вайну. Так, фільм «Цераз могілкі» ўнесены ЮНЕСКА ў спіс 100 найбольш значных карцін на дадзеную тэму, а зняты ў капрадукцыі «Ідзі і глядзі» атрымаў Галоўны прыз журы І Міжнароднага кінафестывалю «Фестроя» ў Партугаліі і ўзнагароду ад ФІПРЭСІ на XIV Маскоўскім кінафестывалі. І гэта толькі малая частка міжнародных дасягненняў «Партызанфільма». Аднак гледачы не зважаюць на той факт, што краіна славіцца і фільмамі для дзяцей. А калі яшчэ пра гэта казаць, як не падчас летніх канікул? «Прыгоды Бураціны», «Пра Чырвоную Шапачку», «Пітэр Пэн», «Казка пра Зорнага хлопчыка» таксама былі зняты студыяй «Беларусьфільм». Першыя дзве найбольш папулярныя сярод гледачоў, і не лішнім будзе нагадаць, якія акалічнасці суправаджалі здымачны працэс і прывялі да такога поспеху.

«Прыгоды Бураціны» (1976)

Карціна планавалася сцэнарысткай Інай Веткінай як пяцісерыйны мультфільм пра піянераў, якія трапілі ў казку. На змяненні сюжэта настаяў рэжысёр Леанід Нячаеў. У абноўленым варыянце Тата Карла зрабіў з гаварлівага палена хлопчыка, якога Ліса Аліса і Кот Базіліа завялі ў Краіну Дурняў. Тут драўляны чалавечак знайшоў не толькі залаты ключык, але і сапраўдных сяброў.

Галоўную ролю выканаў Дзмітрый Іосіфаў, які спачатку быў зацверджаны на ролю Арлекіна. Другі рэжысёр распавядаў, як упершыню ўбачыў будучага Бураціну. Гэта адбылося ў мінскім падземным пераходзе, дзе Уладзімір Паначэўны і прапанаваў падлетку ўдзел у здымках. Хлопчык адмахнуўся ад гэтай ідэі, але пазней яго ўсё-ткі ўдалося ўгаварыць. Актрысу на ролю Мальвіны таксама знайшлі выпадкова. Асістэнтка рэжысёра ехала ў цягніку з Масквы ў Мінск разам з Таняй Працэнкай і яе мамай. Дзяўчынка ўразіла кінематаграфістку артыстызмам.

Бюджэт фільма быў невялікі, а камп'ютарная графіка тады не з'яўлялася распаўсюджаным інструментам. Таму тэатр Карабаса-Барабаса зроблены з чатырох палак і мешкавіны, а гарлачык Чарапахі Тарцілы — з шын і паралону. Нос жа Бураціны насамрэч папяровы. Яго мянялі 45 разоў, з-за чаго ў некаторых эпізодах ён рознай даўжыні. Але ўсё гэта не перашкодзіла фільму стаць культавым.

Акцёры і здымачная група не шкадавалі сябе. Сцэна ў сажалцы з жабамі, ролі якіх выконвалі юныя артысты, здымалася ў лістападзе. У Таццяны Працэнкі, якая сыграла Мальвіну, падчас здымак выпалі малочныя зубы — чакаць, калі вырастуць карэнныя, часу не было, таму прыйшлося ўстаўляць штучныя. А Дзмітрыю Іосіфаву для большай пераканаўчасці згалілі валасы і бровы, замест якіх наляплялі бутафорскія. Ужо не кажучы пра тое, што акцёр фактычна рызыкаваў жыццём у эпізодах з пабітым гарлачом і падвешваннем уніз галавой.

Фота з сайта vokrug.tv

Нават пры такіх ахвярах карціна, на якой вырасла некалькі пакаленняў, магла не з'явіцца на свет. Цэнзары не хацелі выпускаць казку ў пракат. Яе давялося пакінуць толькі праз тое, што яна ўжо была пастаўлена ў план навагодняга эфіру. І дзякуючы гэтаму сёння мы можам атрымаць асалоду ад песні «Бу-ра-ці-на!» ды ўдосталь пасмяяцца з таго, як Кот Базіліа скочваецца па лесвіцы.

«Пра Чырвоную Шапачку» (1977)

Сцэнарый двухсерыйнага фільма Іна Веткіна пісала спецыяльна для Тані Працэнкі, якая сыграла Мальвіну ў «Прыгодах Бураціны». Але незадоўга да пачатку працы актрыса атрымала траўму і адмовілася ад прапановы. У выніку на галоўную ролю Леанід Нячаеў зацвердзіў Яну Паплаўскую.

Здымалі карціну ў Беларусі, недалёка ад месца, дзе цяпер знаходзіцца этнаграфічны комплекс «Дудуткі». Акрамя таго, над стварэннем тэлеказкі працавала народная артыстка БССР Стэфанія Станюта, якая сыграла адну са злых старых.

Па сюжэце музычнай камедыі Старая Ваўчыца помсціць Чырвонай Шапачцы за смерць сына, даручаючы Ваўку злавіць дзяўчынку.

Ідэя фільма прыйшла да рэжысёра нечакана. Ён распавядаў: «Калі мы здавалі "Бураціна", а гэта было пад Новы год, Барыс Хесін, дырэктар творчага аб'яднання "Экран", выклікаўшы мяне ў свой кабінет, спытаў: "Што на наступны Новы год?" А я вазьмі ды ляпні: "Чырвоная Шапачка". Іна Веткіна, аўтарка сцэнарыя, мяне так за спіну ўшчыкнула, што сіняк застаўся». Жанчына не разумела, як з паўтары старонкі тэксту зрабіць сцэнарый для поўнаметражнага фільма, таму вырашылі здымаць не экранізацыю старой казкі, а працяг гісторыі.

Першапачатковы варыянт пад назвай «Нам не страшны шэры воўк» адрозніваўся ад знаёмага нам: у фінале галоўная гераіня ратавала сябе сама, асляпіўшы Ваўка сонечнымі зайчыкамі, а яе бабуля паўставала на экранах дамай у міні-спадніцы.

Падчас здымак узнікалі неспадзяванкі. Напрыклад, з-за вялікай занятасці акцёраў уборы для іх герояў шылі без папярэдняй прымеркі, і большасць з іх убачылі сваю вопратку толькі на пляцоўцы. Усе засталіся задаволеныя касцюмамі, акрамя Ралана Быкава. Ён абурыўся, што на ботах Ваўка ёсць шпоры, а ў яго Паляўнічага няма. Мастачка па касцюмах Людміла Гарохава ўспамінала: «Справа была ў лесе ў Смалявічах, і яшчэ адных шпор тут мы дастаць не маглі. Давялося спешна рыхтаваць машыну ў Мінск. У выніку ў Паляўнічага ў фільме ёсць шпоры, як і ў Ваўка. Хоць яны там, трэба сказаць, і не бачныя амаль».

Але, нягледзячы на цяжкасці, казка мела поспех. Яна падарыла цэламу пакаленню песню «У Афрыцы горы вось такой вышыні» і разуменне, што людзі часам не тыя, кім здаюцца.

Фота з сайта stena.ee

* * *

На «Беларусьфільме» выйшлі таксама «Прададзены смех», «Рыжы, сумленны, закаханы», «Не пакідай...» і многія іншыя культавыя карціны. Гэта было некалькі дзесяцігоддзяў таму, але стужкі не трацяць актуальнасці. Ззастаецца спадзявацца, што студыя паўторыць былы гучны поспех.

Паліна НІКАЛАІДЗІ

Простыя рэчы

Гомельскія музейшчыкі запрашаюць

Прыклад таго, як культурная музейная прастора адгукаецца, насычаецца ідэямі выставачных праектаў ад гарадскога асяроддзя, паказаў Гомель. У Гомельскім палацава-паркавым ансамблі адкрылася выстаўка «Посцілка: дэкаратыўнае вымярэнне». Нарадзілася яна з цікавасці жыхароў горада да натуральнага і, можна сказаць, бытавога працэсу з жыцця экспанатаў музейных фондаў.

Даць магчымасць «дакрануцца» да самабытнай творчасці вясковых ткачых — тканых посцілак і дываноў, якія прадстаўляюць шматгранны феномен беларускай культуры і частку культурнага кода нацыі. Такую задачу ставіць перад сабой выстаўка «Посцілка: дэкаратыўнае вымярэнне». Яна ўпершыню знаёміць наведвальнікаў з калекцыяй посцілак з уласнага музейнага фонду Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, дзе захоўваецца звыш 100 экзэмпляраў тканых вырабаў.

— Ідэя зрабіць выстаўку ўзнікла год таму. Мы зразумелі, што посцілка — не проста элемент традыцыйнай культуры, але і надзвычай цікавы музейны экспанат, — тлумачыць загадчык навукова-фондавага аддзела Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Таццяна Зыгмантовіч. — Летась на тэрасе палаца, на газонах побач з ёй мы праводзілі так званую этнасушку: прасушвалі, праветрывалі прадметы ткацтва з фондаў. Сталася так, што гэты працэс адкрыў для наведвальнікаў парку наш багаты тканы скарб. Людзі дзівіліся прыгажосці саматканых посцілак, дыванкоў. Некаторыя пыталіся нават, колькі каштуе паход на выстаўку, маючы на ўвазе сушку нашых тканых вырабаў, — узгадвае Таццяна Зыгмантовіч.

Асабліва крануў музейшчыкаў водгук на этнасушку жыхаркі Гомеля, якая звязалася з супрацоўнікамі і перадала ў музейную калекцыю посцілкі, што ткала яшчэ яе бабуля. Гамяльчанка перадала і свае дзіцячыя фота за гэтым заняткам разам з бабуляй.

Фотаздымак з ткачыхай — жыхаркай вёскі Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна Еўфрасінняй Міхайлаўнай Карлоўскай — цяпер дэманструецца на візітоўцы выстаўкі «Посцілка: дэкаратыўнае вымярэнне». У адной выставачнай зале прадстаўлена выкарыстанне посцілкі ў вясковым побыце: як захоўваліся вырабы, для чаго выкарыстоўваліся, у другой — розныя дэкаратыўныя рашэнні. Тканыя дыванкі, напрыклад, упісаны ў геаметрычныя формы альбо змікшаваны па сценах залы, нібы паўнавартасныя карціны.

— Мы падкрэсліваем надзвычайную дэкаратыўнасць тканых посцілак. Кожная з іх — яркі, жыццесцвярджальны элемент, які ў вясковай хаце браў на сябе амаль усю ўвагу. Усе яны вельмі актыўныя па малюнках і арнаментах, таму стаяла задача спалучыць іх у адной зале так, каб яны дапаўнялі адна адну і не «спрачаліся», — раскрывае дэталі Таццяна Зыгмантовіч.

Яна нагадвае, што дэкаратыўнасць саматканых посцілак і дываноў прывяла да выкарыстання іх у беларускіх сем'ях як фонаў пры стварэнні знакавых фотаздымкаў, а гэта таксама ператварае ўзорыстыя вырабы ў культурны феномен.

— Калі рыхтавалі выстаўку, праз сацыяльныя сеткі звярнуліся да гамяльчан з просьбай даслаць сямейныя фотаздымкі на фоне посцілак і дыванкоў. Вядома ж, гэты элемент аздаблення жылля быў раней асабліва папулярны як фотафон. На шчасце, людзі адгукнуліся, даслалі фатаграфіі і такім чынам дапамаглі ў падрыхтоўцы.

У залах прадстаўлены посцілкі, якія захоўваюцца ў музейных фондах Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Гэты скарб — здабытак супрацоўнікаў музейнай установы з экспедыцый 1970—1980-х гадоў. Таксама дэманструюцца прадметы тканага мастацтва, перададзеныя жыхарамі Гомельшчыны ў музей у розныя гады. Самыя старэйшыя па ўзросце посцілкі — 1938 года, самыя маладыя — пачатку 1980-х. Тут сабраны тканыя вырабы амаль з усіх раёнаў Гомельскай вобласці і Краснапольскага раёна Магілёўшчыны.

Наталля КАПРЫЛЕНКА
Фота аўтара

зваротная сувязь

Жыццё — не толькі тэатр

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Перадача «Адным штрыхом» з вершамі беларускіх аўтараў выходзіць па буднях у 07:20, 13:25 і 18:10. Праграма «Радыёсерыял» гучыць з панядзелка да пятніцы ў 8:45 і 18:45 і прапануе старонкі аповесці Таісы Бондар «Час, калі нас любілі».

Праграма «Літаратурная анталогія» па буднях у 14:15, 22:30 прапануе старонкі рамана Уільяма Сомерсета Моэма «Тэатр». У «Радыёбібліятэцы» ў панядзелак — пятніцу ў 11:00, 20:30 слухайце твор Якуба Коласа «Новая зямля». У 20:30 па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні беларускіх і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у суботу і нядзелю ў 12:05 і 18:50 прагучаць вершы Паўла Марціновіча.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю (пачатак эфіру ў 21:30) складуць дзве часткі радыёспектакля «Сэрца на далоні» паводле аднайменнага рамана Івана Шамякіна. У «Дзіцячым радыётэатры» ў выхадныя ў 10:05 юныя слухачы пачуюць радыёспектакль «Галёшы шчасця» на аднайменнай казцы Ханса Крысціяна Андэрсэна, пастаноўку «У гасцях у казкі» паводле твораў Рэдзьярда Джозэфа Кіплінга і «Казку пра смелага вожыка» Алеся Якімовіча.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні выходзіць твор Наталлі Бучынскай «Квафея, Кваканцыя і "жабіны вочкі"». Штовечар у 21:00 для маленькіх прапануецца «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў.

У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з калекцыянерам Ігарам Сурмачэўскім. Новы выпуск праекта гэтага аўтара «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер у 08:15 і 13:30.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

13 жніўня — 110 гадоў з дня нараджэння Анатоля Багатырова (1913—2003), беларускага кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, народнага артыста Беларусі.

13 жніўня — 70-гадовы юбілей адзначае Людміла Гатальская (1953), беларуская мастачка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

14 жніўня — 90-годдзе святкуе Леанід Свердэль (1933), беларускі кампазітар.

15 жніўня — 105 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кульваноўскага (1918—2003), беларускага мастака тэатра, графіка, жывапісца.

15 жніўня — 70-гадовы юбілей адзначае Аляксей Панцюк-Жукоўскі (1953), беларускі жывапісец.

16 жніўня — 95 гадоў з дня нараджэння Аляксея Бяляева (1928—1990?), беларускага акцёра, рэжысёра, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

16 жніўня — 95 гадоў з дня нараджэння Браніслава Спрынчана (1928—2008), беларускага паэта, перакладчыка.

16 жніўня — 90 гадоў з дня нараджэння Віталя Чацверыкова (1933—1983), беларускага кінарэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, народнага артыста Беларусі.

16 жніўня — 80-гадовы юбілей святкуе Дзмітрый Бабкін (1943), беларускі мастак-афарміцель.

17 жніўня — 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мацвеенкі (1928—2021), беларускага паэта.

18 жніўня — 85-годдзе святкуе Юрый Любімаў (1938), беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

18 жніўня — 75-годдзе адзначае Мікалай Кулеш (1948), беларускі жывапісец.

18 жніўня — 70-годдзе адзначае Аляксандр Папоў (1953), беларускі акварэліст.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 10.08.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 655

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 1816

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 23032